Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ялы прымаюцца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародзьня	— 20 к.
мясцовыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок капарэлі пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок капарэлі насьпрад тэксту	1 р. — к.
За радок капарэлі перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьпецыяльныя на 60 проц. дарагей.

Зьніж тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумэнт	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумэнт	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГО'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 174 (2362) Нядзеля, 29-га ліпеня 1928 г.

Фінансаваньне народнай гаспадаркі і 2-я пазыка індустрыялізацыі.

Перад нашай народнай гаспадаркай стаяць вялізарныя нявырашаныя яшчэ задачы. Гаспадарчыя замінкі бягучага году, у асноўным выкліканыя таварным голадам, гавораць пра тое, што тэмп разгортваньня нашай прамысловасьці яшчэ недастатковы, што трэба ўзмацніць тэмп капітальнага будаўніцтва, ня гледзячы на тое, што за апошнія тры гады ў дзяржаўную прамысловасьць і электрыфікацыю ўкладзена яшчэ каля 3 міліярдаў 800 міліёнаў рублёў. Пытаньне аб капітальных укладаньнях у прамысловасьць зьвязваецца з цэлым шэрагам іншых праблем. Першае месца тут займае праблема экспарту. Для рэканструкцыі прамысловасьці на новай тэхнічнай аснове патрэбна абсталяваньне і пераабсталяваньне фабрык новымі ўдасканаленымі машынамі, а гэтага можна дасягнуць у значнай меры шляхам імпарту. Мы ня можам дапусьціць у інтарэсах нашай валюты і грашовага звароту разрыву ў замежным гандлёвым балянсе, а мы павінны імкнуцца да таго, каб наш гандлёвы балянс зрабіўся актыўным. Вось чаму экспартная праблема набывае выключнае значэньне.

Бюджэт 1928-29 г. павінен прадугледзіць сродкі на фарсираваньне экспарту, і тут гэта задача ўвязваецца з другімі дзьвюма задачамі па пашырэньню капітальных укладаньняў у чыгуначны і водны транспарт і ў сельскую гаспадарку.

Праблема разьвіцьця экспарту можа быць разьвязана пабудовай новых чыгуначных шляхоў для дастаўкі хлеба ў парты, палепшаньнем воднага транспарту, пабудовай элеватараў, халадзільнікаў, абсталяваньнем партоў і г. д. Процант росту выдаткаў на капітальнае будаўніцтва ў гэтым напрамку павінен быць вельмі значным.

Разьвіцьцё і ўзмацненьне сялянскай гаспадаркі, інтэнсыфікацыя і індустрыялізацыя яе, арганізацыя буйных вернавых савгасаў, гэтых «хлебных фабрык», маючых вялізарнае значэньне для вырашэньня экспартных задач, садзейнічаньне разьвіцьцю калектыўных гаспадарак—вымагаюць бу[illegible] асигнаваньняў з дзяржа[illegible]жэту.

Узросшыя матар'яльныя і культурныя патрэбы працоўных мас у галіне жыльлёвага будаўніцтва, камунальнай гаспадаркі, народнай асьветы, аховы здароўя выклікаюць таксама неабходнасьць у водпуску вялікіх сродкаў.

Усе пералічаныя патрэбы, узьнікаючыя ў працэсе разьвіцьця народнай гаспадаркі і пільна вымагаючыя здаволеньня, упіраюцца ў нашы фінансавыя магчымасьці. Самыя аптымістычныя бюджэтныя меркаваньні на будучы год яе у адносіне накапленьня сродкаў у самай прамысловасьці, так і ў сэнсе атрыманьня прыбыткаў ад дзяржаўнай гаспадаркі ня могуць забясьпечыць поўнасьцю неабходнага тэмпу разгортваньня асноўных галін народнай гаспадаркі.

Трэба ўлічыць, што выцясьненьне прыватнага капіталу з тавараазвароту, якое азначае перамогу сацыялістычнага сэктару народнай гаспадаркі, хоць і замяняецца ўзмацненьнем каапэрацыйнага звароту і звароту дзяржаўнага гандлю, усё-ж зьмяншае фінансавы эфэкт для дзяржаўнага бюджэту.

Такім чынам, значэньне аднэй з асноўных крыніц, а ўласна скарыстаньне зьбераженьняў і накапленьняў насяленьня, на якую зазначыў яшчэ XV зьезд партыі, павінна ўзрасьці ў агульнай сыстэме фінансаваньня народнай гаспадаркі.

Вопыт рэалізацыі 1-й пазыкі індустрыялізацыі ўвосень 1927 г. на суму 200 міліёнаў руб. па Саюзу паказаў, што ідэя пазыкі індустрыялізацыі народнай гаспадаркі спаткала жывое і гарачае спачуваньне сярод шматмілённай масы працоўных. Уся кампанія па рэалізацыі пазыкі прайшла пад знакам вялікага грамадзкага ўздыму.

Урадам СССР в восені бягучага году выпушчаецца пазыка ў 500 міліёнаў руб. на ідустрыялізацыю краіны, на капітальнае будаўніцтва ў галіне прамысловасьці і сельскай гаспадаркі.

Гэта—вельмі значная сума. Першая пазыка індустрыялізацыі ахапіла 60 проц. усіх працуючых прафсаюзаў. Сярэдні разьмер падпіскі на аднаго рабочага і служачага складае каля 30 проц. месячнай зарплаты. Новая пазыка індустрыялізацыі будзе патрабаваць больш напружаньня ад кожнага працоўнага, але не ахвяр, бо кожны працоўны зараз ужо разумее, што яго ўдзел у дзяржаўных пазыках—важны як з пункту погляду грамадзка-эканамічнага, так і з пункту погляду інтарэсаў асабіста—гаспадарчых.

Новая пазыка таксама разьлічана і на вёску. Пазыка ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі не ахапіла ўсе пласты вёскі. Задача ўцягненьня ў сацыялістычнае будаўніцтва вольных зьбераженьняў сялянства стаіць яшчэ перад савецкай грамадзкасьцю ва ўсёй паўнаце.

Рабочыя і сялянскія масы Беларусі павінны будуць прыняць адпаведны ўдзел у рэалізацыі пазыкі. Папулярнасьць першай пазыкі індустрыялізацыі сярод рабочых мас нашай рэспублікі, параўнаўчы посьпех пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі слу[illegible] [illegible]ай, што працоўныя БССР [illegible] абавязак перад за[illegible] і перад працоўнымі Саюзу па ўзмацненьні сацыялістычнага будаўніцтва.

Толькі адны капітальныя ўкладаньні ў рэспубліканскую прамысловасьць БССР на 1928-29 г. павінны ўзрасьці на 50 проц. Замест 15 міліёнаў капітальных укладаньняў у бягучым годзе, патрэбна будзе 24 міліёны ў будучым годзе. Яшчэ больш патрабаваньняў прад'яўляецца ў гэтай адносіне нашаму рэспубліканскаму бюджэту. Калі наш бюджэт у бягучым годзе фінансуе капітальнае будаўніцтва прамысловасьці ў суме каля 6 міліёнаў руб., то па меркаваньнях на будучы год гэта фінансаваньне павінна скласьці суму каля 15 млн. руб. Таксама павінен быць узмоцнен тэмп капітальных укладаньняў сельскай гаспадаркі БС[illegible]

Ажыцьцяўленьне гэтай [illegible] даўніцтва магчыма [illegible] ным падтрыман[illegible] нашай рэс[illegible] рэалізаг[illegible]

VI кангрэс Камінтэрну.

СПРЭЧКІ ПА ДАКЛАДУ Тав. БУХАРЫНА.

На ранішнім пасяджэньні кангрэсу Камінтэрну 27 ліпеня цягнуліся спрэчкі па дакладу тав. Бухарына.

Тав. Ленблі (Англія)

адзначае, што буйнейшай перашкодай у барацьбе работніцкай клясы ў Англіі выўлянецца генэральны савет трэд'юніёнаў, які знаходзіцца ў вельмі цеснай сувязі з клясай капіталістаў. Рэфармісты робяць усе захады, абы выцісьнуць камуністаў з прафсаюзаў. Аднак, дзеля таго, што народныя гушчы аб'яднаны ў рабочай партыі і ў прафсаюзы, трэба спрабаваць, насупроць палітычнага выключэньня з саюзаў, якую праводзяць рэфармісты, замацаваць у масах свае пазіцыі і весьці барацьбу аб адзіным фронце разам з шырокімі пластамі насельніцтва проці капіталістаў і рэфармістаў.

Тав. Кошчаў (Польшча)

падкрэсьліў, што значэньне польскай сэкцыі вельмі вялікае для ўсяго Камінтэрну, бо патугі імпэрыялістычнай буржуазеі, накіраваныя супроць СССР, канцэнтруюцца ў Польшчы.

Польская камуністычная партыя ў сёнешнія дні, пасьля выпраўленьня буйных апартуністычных памылак асабліва ў сувязі з пераваротам Пілсудскага, мае правільную палітычную лінію, аснаваную на правільным аналізе.

Галоўнейшыя задачы польскай кампартыі—барацьба супроць нападу на СССР, шляхам папулярызаваньня ўсіх дасягненьняў пралетарскай краіны, увязаная з барацьбой за штодзённыя дамаганьні рабочых, забясьпечаньне правільнага кіраўніцтва партыяй і ліквідацыі фракцыйнай барацьбы. Апазіцыя вядзе жорсткае наступленьне і супроць соймавай фракцыі, на якую валяцца безперапынныя рэпрэсіі.

Забясьпечаньне правільнага кіраўніцтва магчыма ня шляхам устанаўленьня партыйнага кіраўніцтва, загартованага ў шматгадовай барацьбе, а толькі шляхам аднаўленьня адзінства, на аснове правільнай лініі партыі пры [illegible]радкаваньні меншасьці большасьці.

Тав. Эвэрт (Нямеччына)

кажа, што ў нямецкай дэлегацыі няма ніякіх па сутнасьці рознагалосьсяў з тэзісамі Бухарына, хаця некаторыя таварышы лічаць пэрспэктывы, выкладзеныя ў тэзісах, занадта пэсымістычнымі. Вязумоўна, вельмі лёгка было-б даваць палкую пэрспэктыву з вызначэньнем кароткага тэрміну, але-ж першай спасылкай усякай рэвалюцыйнай тактыкі зьяўляецца рэальная, правільная пэрспэктыва бяз усялякіх аздобленьняў.

Галоўнейшыя задачы [illegible] чаюцца ў якна[illegible]

лаватых пунктаў імпэрыялістычных супярэчнасьцяй.

У сучасны момант,—прадаўжае прамоўца, — на поўдні Кітаю налева і направа адбываюцца сялянскія паўстаньні, часта пад кіраўніцтвам кампартыі, і дайшоўшыя да таго, што выгналі ў шмат якіх мясцох абшарнікаў і арганізавалі саветы. Наша тактыка ў адносінах да сялянства ня была сусім бальшавіцкай, мы павінны прытрымлівацца правільнай бальшавіцкай лініі і стаць на ча[illegible] сялянскіх рэвалюцыйных масаў. Нашай асноўнай задачай павінна быць — барацьба за масы і падрыхтоўка новых рэвалюцыйных боек, якія праз узброенае паўстаньне прывядуць да пераможнай рэвалюцыі. Перад тварам няўхільна пасьлядоўчых сутычак імпэрыялістаў у Кітаі прамоўца прасіць кангрэс удзяліць максымум увагі далёкаму ўсходу і забясьпечыць больш цесную сувязь між кітайскай кампартыяй і іншымі сэкцыямі Камінтэрну.

Т. Рэст (камсамол Англіі)

адзначае, што кампартыі павінны зьвярнуць значна больш увагі на ўзмацненьне руху моладзі, чым да гэтай пары. Пасьля прамовы Рэста раніш-няе пасяджэньне абвяшчаецца зачыненым.

У вячэрнім пасяджэньні кангрэсу Камінтэрну 27-га ліпеня цягнуліся спрэчкі па дакладу т. Бухарына.

Пасьля т. Мэльхіара, прамовай якога пачалося пасяджэньне, выступіўшы тав. Лазоўскі, спатканы воплескамі.

ПРАМОВА Т. ЛАЗОЎСКАГА.

4-ы кангрэс Прафінтэрну, зачынены некалькі месяцаў таму назад, сказаў Лазоўскі,—прарабіў вялізарную працу, прааналізаваўшы ўсе галіны рэвалюцыйнага прафруху з усімі іх асаблівасьцямі. Вынікам гэтай працы зьявіўся цэлы рад рэвалюцый, прынятых аднагалосна ўсімі дэлегатамі кангрэсу, як камуністамі, так і беспартыйнымі. Аднак, пасьля зачыненьня кангрэсу выявілася апазіцыя ў адносінах да прынятых пастаноў, асабліва ў Нямеччыне і ў Злуч. Штатах. Каб зразумець сэнс гэтай апазіцыі, трэба каротка ахарактарызаваць усе новыя ідэі, якія былі фармуляваны ў рэзалюцыях 4-га кангрэсу Прафінтэрну. У лік гэтых новых мамэнтаў адносяцца: завастраньне барацьбы з рэфармізмам і Амстэрдамскім Інтэрнацыяналам, правядзеньне тактыкі адзінага фронту, галоўным чынам, зьнізу, кіраўніцтва эканамічнай барацьбой пралетарыяту і пры гэтым проці прафсаюзнага апарату ў тых выпадках, калі ён сабатуе гэту барацьбу, умацаваньне рэвалюцыйных прафаб'яднаньняў у краінах, ахопленых прафрухам і пры гэтым ня толькі пры помачы індывідуальнага вярбаваньня членаў, але і шляхам заўладаньня рэфар[illegible] [illegible]ямі, цягненьне неарганізаваных у новыя прафса[illegible] у тых краінах, дзе асноўны пласт пралетарыяту знаходзіцца вонках прафсаюзаў і, нарэшце, узмацненьне барацьбы з няправільна зразумелай тактыкай адзінага фронту.

Таварышы з правага крыла нямецкай кампартыі выступілі супроць гэтых рэзалюцый і пры гэтым у гэткім духу, які набліжае іх з сацыял-дэмакратамі. Крыніцай усіх гэты[illegible] вільных ацэнак зь[illegible] лівае ўяўле[illegible] най па[illegible]

фармісцкай палітыкай расколу пад плашчом адзінства. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на дзейнасьць групаў адзінства.

Трэба прызнаць, што пакуль што яны вельмі слабыя і ніякай пасьпяховай барацьбы з палітыкай выключэньняў не вядуць. Групы адзінства ў Нямеччыне дапусьцілі цэлы рад наяўна апартуністычных памылак. Кангрэс Прафінтэрну зьвярнуў таксама ўвагу на недастатковае ўсьведамленьне міжнароднай салідарнасьці пралетарыяту. Трэба прызнаць, што 2-хтыднёвая кампанія абароны Кітаю не прайшло так пасьпяхова, як гэта павінна было быць. Кангрэс Прафінтэрну адзначыў, што рэфармізм у міжнародным маштабе жыве яшчэ, але не настолькі, паскольки жыве і міжнародны капіталізм. Ад часу 5-га кангрэсу Камінтэрну, сілы Прафінтэрну вырасьлі і наша барацьба з капіталізмам і ягонымі лёкаямі ўзмацнілася (бурныя воплескі).

Т. Лі-Куан (Кітай)

гаворыць, што ў сучасны момант асноўныя задачы нашай партыі: узмацненьне барацьбы з імпэрыялізмам, арганізацыя рэвалюцыйных сіл пралетарыяту і сялянства і паглыбленьне работы [illegible] прафсаюзах, каб, такім чынам, дабіцца напырэньня нашага ўплыву сярод працоўных. Кампартыя Кітаю выказвае пажаданьні аб навязаньні больш моцнай сувязі між ёй і іншымі сэкцыямі Камінтэрну.

Т. Ленскі (Пол[illegible]

гаворыць [illegible]

Амэрыка заключыла новы дагавор з Кітаем

ЯПОНІЯ СУПРОЦЬ ПЕРАГЛЯДУ ДАГАВОРУ.

Амэрыканска-кітайскі дагавор і Японія.

НЬЮ-ЁРК, 27-7. Артыкул першага праэкту новага кітайска-амэрыканскага дагавору анулюе ранейшыя дагаворы і агаласшае прынцып мытнай аўтаноміі Кітаю, а таксама прынцып найбольш спрыяючай нацыі. Апроч таго, у гэтым артыкуле гаворыцца: «падданыя абодвых бакоў, якія жывуць на тэрыторыі другой краіны, ня могуць быць прымушаны плаціць якія-небудзь падаткі або зборы па больш высокіх стаўках, як падданыя гатай краіны або іншыя чужаземцы».

ПЕКІН, 26-VII. Па дагавору Амэрыкі з Кітаем—Кітай атрымлівае таможную аўтаномію 1 студзеня 1929 году, пры ўмове, што да тэй пары дагавор будзе ратыфікаваны абодвума бакамі. Японскі пасол у Пекіне Іосізава заявіў у Інтэрв'ю адносна новага кітайска-амэрыканскага дагавору, што гэты дагавор абмяжоўваецца толькі пытаньнем аб мытных стаўках і зьяўляецца «вельмі простай справай». Іосізава, аднак, прызнае, што гэты дагавор «цалкам выказвае сяброўскія пачуцьці Амэрыкі ў адносінах Кітаю» Далей, Іосізава спасылаўся на марудныя высілкі Японіі найсьці пасатканьне імкненьням Кітаю» і заявіў, што толькі захаваньне нанкінскага ўраду, які пастанавіў ануляваць кітайска-японскі дагавор, прымусіла Японію заняць сёньняшнюю пазицыю.

Япона-кітайскі канфлікт.

ШАНХАЙ, 27-7. У цэнтры ўвагі палітычных і грамадзкіх колаў Шанхаю—пытаньне аб пераглядзе кіроўных дагавораў і адносіны да яго в бою розных дзяржаў. Нанкінскае міністэрства замежных спраў даручыла пасланьніку Японіі Ван-Юн-Бао заявіць японскаму ўраду рашучы пратэст проці ўмешваньня ва ўнутраную палітыку Кітаю, якое перашкодзіла Чжан-Сюэ-Ляну прыйсьці да згоды з Нанкінам. Нанкінскае міністэрства замежных спраў даручыла Ван-Юн-Бао вымагаць адкліку японскага консула з Мукдэну. Як паведамляе друк, партугальскі пасланьнік у Пекіне паведаміў нанкінскае міністэрства замежных спраў аб тым, што партугальскі ўрад даручыў яму распачаць перамовы аб падпісаньні новага каморцыйнага дагавору з Кітаем. «Сін-Ван-Бао» перадае заяву французкага консула ў Шанхаі аб пастанове французкага ўраду адкліканць 4-ю частку французкага войска ў Кітаі, а рэшту пасьля канчатковае ліквідацыі грамадзянскае вайны ў Кітаі. Нанкінскі міністэр замежных спраў Ван-Чжэн-Цін паведаміў у інтэрв'ю для «Шун-Бао», што Данія і Італія афіцыйна заявілі аб сваіх палітычных адносінах да перагляду дагавораў. У бліжэйшы час распачнуцца перамовы з Бельгіяй і Гішпаніяй.

* * *

ПЕКІН, 27-7. Горад Фан-цзэ падвяргнуўся налёту японцаў, якія вярбілі там па ўсёй мясцовасьці пэратрусы і арышты.

„Сур'ёзныя падзеі" ў Чэнчжоу.

ПЕКІН, 27-7. Газэта «Шун-Бао» з Гонконгу паведамляе «аб сур'ёзных падзеях» у Чэнчжоу на поўдні Хунаня. Тэлеграф між Чаншы (сталіца Хунаня і Чэнчжоу перарваны. Маркуюць, што ў гэтым раёне адбываюцца ваенныя дзеяньні. Падрабязнасьці невядомы.

Вымаганьні „левых" гаміндананаўцаў.

ПЕКІН, 27-7. Як паведамляе «Сін-Ван-Бао», на канфэрэнцыі „левых" гаміндананаўцаў ухвалена пастанова ўдзельнічаць у надыходзячым 5-м пленуме ЦК Гаміндану. У гутарцы з супрацоўнікам газэты Чэн-Шу-Жэн адзін з „левых" лідэраў заявіў, што „левыя" будуць вымагаць: 1) неадкладнага адраджэньня масавага народнага руху, каб ня даць камуністам скарыстацца становішчам, 2) барацьбы за дабрабыт мас, а ня меншасьці, 3) аднаўленьня дысцыплёны ў партыі, якой павінны падпарадкоўвацца ўсе бяз выключэньня, разам з тымі, і ваенныя дзеячы, 4) зьнішчэньня пасады генэралісімуса. Другі прадстаўнік „левых" Лі-Фу-Лін заявіў прадстаўніку газэты, што хоць у Гуандуне ўсё спакойна, аднак камуністы там толькі «чакаюць выгоднага выпадку»; а таму разгоняць армію ў Гуандуне прадчасна.

Падрыхтоўка перавароту ў Польшчы.

ВАРШАВА, 27-7. Сёньня нека-[illegible] газэты [illegible] торыя газэты [illegible] што асеньня [illegible] ніцца не[illegible]

ЛЕНІН НА II ЗЬЕЗЬДЗЕ ПАРТЫІ.

II зьезд партыі быў буйнейшым этапам у разьвіцьці сацыял-дэмакратычнае партыі Расеі. Яго гістарычнае значэньне заключалася ня толькі ў тым, што ён аформіў сацыял-дэмакратычную партыю, ператварыў падзеленыя гурткі ў адзіную арганізацыю, але і, галоўным чынам, ў тым, што ён быў выходным пунктам афармленьня бальшавізму ў Расеі, выходным пунктам перамогі ідэй рэвалюцыйнага марксызму над ідэямі апартунізму.

Ленінскае крыло партыі стварылася ня раптам і не выпадкова. З 1900 г. —году арганізацыі «Іскры»—паступова пад кіраўніцтвам Уладзімера Ільліча на ідэях рэвалюцыйнага марксызму, у працэсе барацьбы з самаўладзтвам і буржуазеяй, у барацьбе з эканамізмам і роднымі яму апартуністычнымі плынямі складаўся і выхоўваўся кадр прафесыянальна-рэвалюцыянэраў,—буду чы касьцяк бальшавіцкага ядра зьезду.

У сваіх працах гэтага пэрыяду Ленін рашуча адмяжоўваецца ад розных апартуністычных плыняў і замест іх тэорыі высоўвае свае прынцыпы—пабудовы рэвалюцыйнае партыі пралетарыяту.

Яшчэ ў адозьве, выдадзенай у 1900 г. перад выхадам «Іскры», яе рэдакцыяй высоўвалася ў якасьці асноўнае ўмовы для аб'яднаньня партыі задача рашучага і паступовага разьмежаваньня з усімі плынямі, выступаючымі пад сьцягам марксызму, па сутнасьці-ж нічога агульнага з ім ня маючымі. «Раней, чым аб'яднацца,—гаворыць адозва,—мы павінны рашуча і паўна разьмежавацца». І гэтае разьмежаваньне было выканана «Іскрай» пад кіраўніцтвам Леніна і Плеханава. Уся дзейнасьць «Іскры» была накіравана на абарону марксызму ад рознага роду «крытыкаў», паганячых марксызм, ператвараючых яго з вучэньня аб незаміручасьці клясавае барацьбы ў капіталістычнай грамадзе, у вучэньне павольнага, спакойнага нерэвалюцыйнага разьвіцьця капіталістычнае грамады ў сацыялістычную і такім шляхам па сутнасьці адхіляючых усю тэорыю рэвалюцыйнага марксызму. У процілеглясьць гэтым крытыкам Ленін заяўляў, што «мы стаім цалкам на грунце тэорыі марксызму», што «нашай асноўнай задачай зьяўляецца арганізацыя і кіраўніцтва клясавай барацьбой пралетарыяту, канчатковая мэта якое—заваёва палітычнае ўлады пралетарыятам і арганізацыя сацыялістычнае грамады». Ленін вымагаў рашучае барацьбы як з заходня-эўрапейскімі апартуністамі тыпу Бэрнштэйна, так і яго расейскімі прыхільнікамі—эканамістамі, укараніцелямі ідэй апартунізму на расейскай глебе.

Рашучая і незаміручая барацьба ў пытаньнях тэорыі са ўсімі разнавіднасьцямі апаратунізму, пад якім-бы яны сьцягам ні выступалі,—вось праграма, якую праводзіў у жыцьцё Ленін у пэрыяд афармленьня сацыял-дэмакратычнае партыі і падрыхтоўкі II-га крытыкуючы іх палажэньні аб падначаленьні руху пасьлядоўна-рэвалюцыйнае клясы-пралетарыяту—кіраўніцтву нерэвалюцыйнага расейскага буржуазнага лібэралізму, іх тэорыю адхіленьня палітычнае барацьбы і тэорыю стадый, ператвараючых рух рабочае клясы ў просты дадатак да руху лібэральнае буржуазеі.

Паступовае высоўваньне ідэі гегемоніі пралетарыяту ў рэвалюцыйным руху—вось пазіцыя Уладзімера Ільліча ў тактычных пытаньнях. «Толькі ў тым выпадку,—казаў Уладзімер Ільіч,—рабочая кляса здолее выкарыстаць буржуазны рух і кіраваць рухам дробнае буржуазеі, асабліва сялянствам, калі ён будзе самастойным у пытаньнях тэорыі, тактыкі, арганізацыі». Ён не адхіляў, як эканамісты, неабходнасьці выкарыстаньня руху лібэральнае буржуазеі. Ён пісаў: «Партыя пралетарыяту павінна ўмець лавіць кожнага лібэрала якраз у той момант, калі ён зьбіраўся прасунуцца на вяршок, і прымусіць яго прасунуцца на аршын. А калі не захоча—мы пойдзем наперад без яго і праз яго». (т. IV стар. 89). Ленін ня вельмі верыў у рэвалюцыйнасьць расейскае буржуазеі; яе нездольнасьць, нерашучасьць да барацьбы з самаўладзтвам ён бачыў ясьней многіх тагочасных правадыроў сацыял-дэмакратыі. Але, бачачы гэта, ён ня мог прытрымлівацца пункту погляду эканамістаў адхіляўшых неабходнасьць выкарыстаньня лібэральнага руху, выкарыстаньне кожнага незадаволеньня розных пластоў насельніцтва для барацьбы з самаўладзтвам, таму што гэта было-б раўнамоцна, па думцы Леніна, адмове ад гегемоніі пралетарыяту, перадачы кіраўніцтва рэвалюцыйнай барацьбой у рукі буржуазнае дэмакратыі, што ахвяроўвала-б рабочую клясу на ролю дадатка буржуазнае дэмакратыі.

Але роля Леніна распрацоўкай тэорыі і тактыкі сацыял-дэмакратычнае партыі ня вычэрпваецца, яму належыць таксама заслуга ў выпрацоўцы прынцыпаў арганізацыі і самаарганізацыя партыі. Яго плян пабудовы партыйнае арганізацыі быў дыямэтральна процілеглы пляну, які баранілі эканамісты. Эканамісты дамагаліся выбарнасьці ўсіх арганізацый зьнізу да верху. Ленін даказваў, што гэта ва ўмовах царскае Расеі справа шкодная, што гэта гульня ў партыю, а не арганізацыя баявой партыі для барацьбы з царызмам і буржуазеяй, і замест гэтага высоўваў плян арганізацыі законспіраванае партыі прафесыянала-рэвалюцыянэраў, пабудаванай зьверху ўніз. Гэтая законспіраваная арганізацыя не павінна быць адмежавана сьцяной ад рэшты рабочае клясы. Яна павінна быць зьвязана з ёю пры дапамозе цэлага шэрагу поўлегальных і легальных гурткоў і іншых арганізацый. Толькі пры гэтых умовах партыя сапраўды здолее ажыцьцёвіць кіраўніцтва штодзённае барацьбы рабочае клясы—казаў Ленін.

Рашучае разьмежаваньне па ўсіх [illegible] тактычных і ар- [illegible] ных з апартуні- [illegible] са ўсёй [illegible] II [illegible]

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Пад пагрозай зрыву.

ЧАРЭЯ, 28-7. Да пабудовы камбінату-электрастанцыі, млыну і інш. ў м. Чарэі рыхтаваліся больш году, а як толькі распачалі будаўніцтва—адразу сталі пад пагрозай зрыву ўсяго будаўніцтва з-за недахвату матар'ялу, асабліва цэглы. Дзякуючы гэтаму недахопу прышлося прыпыніць працу на месяц з 20 чэрвеня да 20 ліпеня. Прайшло 20 ліпеня, а праца распачацца ня можа, бо зноў «праклятай» цэглы няма... Вытрабаваная арцель каменшчыкаў з гор. Смаленску прымушана была забраць манатні і паехаць назад. Безгаспадарчасьць Камгасу і Райвыканкому не адну тысячу рублёў пусьціла на вецер. Зімой можна было закупіць цэглу ў любой колькасьці па 40 р. за тысячу, але да будаўніцтва было „далёка" і „гаспадарнікі" не закупілі яе, а летам затое плацілі па 70 р. за тысячу, ды і то знайсьці нельга. Можна лічыць, што будаўніцтва Чарэйскага камбінату ў гэтым годзе сарвана.

Не харчаваньне, а пакута.

Выдрыца. На Асінстроі зусім дрэнныя ўмовы для падзённых рабочых у сэнсе атрыманьня гарачай стравы ў поўдзень. Паўднёвы перапынак бывае ад 12 да 13 гадзін і за гадзіну харчэўня павінна прапусьціць 250-300 чал., а зьмясьціцца ў ёй могуць толькі 60 чалавек. Можна ўявіць, што робіцца ў харчэўні ў часе абеду. Некаторыя застаюцца зусім без абеду, вынікаюць міжвольныя спазьненьні на працу.

Адміністрацыя павінна ўстанавіць тэрміны абедаў з 12 да 13 гадзін да сезонна-падзённых рабочых, а з 13 да 14 для зьдзельшчыкаў, якія самі могуць меркавацца сваім часам. Таксама трэба папырыць памяшканьне харчэўні і павялічыць штат хаця-б на аднаго працаўніка.

Да асеньняй сяўбы.

Бабруйск, 28-7. Да асеньняй сяўбы ў мэтах пашырэньня гатунковага насеньня ў калгасы округі будзе накіравана 4.800 пуд. высокагатунковага жыта. Апрача таго, з калгасаў будзе выдадзена на абмен сялянству гатунковага жыта 4.100 пуд.

Калгасы ў час асеньняй сяўбы аказваюць гужавую дапамогі сотні бядняцкім гаспадаркам і адсартуюць на сваіх машынах 5 тысяч пудоў сялянскага збожжа.

Кантрактацыя жыта.

Бабруйск, 28-7. У часе асеньняй сяўбы бягучага году на Бабруйшчыне будзе закантрактавана 12.500 гэктар. пасеву азімага жыта.

У часе правядзеньня кантрактацыі пасеўшчыкам будуць выдавацца авансы ад 7 да 9 руб. на гэктар, а таксама яны будуць здавальняцца насеньнем, мінэральным угнаеньнем і сельска-гаспадарчымі машынамі.

Ёсьць імкненьне праводзіць кантрактацыю пасеваў жыта цэлымі насельнымі пунктамі (вёскамі, пасёлкамі і г. д.

Працу па кантрактацыі будзе праводзіць крэдытная каапэрацыя.

Павялічэньне аб'ектаў абкладаньня.

Жлобін, 28-7. Па Жлобінскім раёне сёлета ўлічана аб'ектаў абкладаньня больш мінулагоднага, пахаці—на 3347 дзес., сенажаці—на 2153 дзес., буйн. жывёлы—на 597 штук, коняй—на 234 шт., сьвіней—на 1303 штукі і неземляробчых заробкаў—на 114194 рублі.

Злучэньне калгасаў.

Бабруйск, 28-7. З мэтай узмацненьня гаспадарчага становішча, калгасы „Расьсьвет", і «Раніца Камуны» [illegible] выліліся ў адзін калгас. [illegible] момант аб'яднаны калгас [illegible] трактар, ма- [illegible] сы са- [illegible] волю.

Царкву пад школу.

Копысь, 28-7. *У вёсцы Старасельле сяляне пастанавілі разабраць [illegible]ую царкву і ўвесь матар'ял пусьціць на пабудову новай школы-сямігодкі. Зараз царква сялянамі разабрана і ўвесь будаўнічы матар'ял перавезен на месца пабудовы школы.*

Вялікі наплыў заяў у земляўпарадчы тэхнікум.

Магілеў. За час ад 1-га да 25-га ліпеня паступіла 581 заява.

Заявы будуць прымацца да 1-га жніўня. У апошнія дні паступае 40-45 заяў штодня.

Можна спадзявацца, што ўсяго будзе да 900 чалавек, жадаючых паступіць у тэхнікум.

Масты, школы, лазьні—за самаабкладаньне.

Амсьціслаў, 28-7. Да гэтага году ў Шашаўскім с.-с., Амсьціслаўскага р. усе масты былі разбураны, ня было сродкаў, каб пабудаваць іх. З правядзеньнем закону аб самаабкладаньні зьявілася магчымасьць пабудаваць масты. Зараз скончана пабудова васьмі мастоў, складзен праэкт пабудовы агульнай лазьні, а таксама распачата пераабсталяваньне Несьцераўскай школы, на якую будзе затрачана 800 рублёў.

На электрычную цягу.

Бабруйск, 28-7. Згодна акруговама пляну вясковай электрыфікацыі, на электрычную цягу ў наступным гаспадарчым годзе мяркуецца перавесьці шэраг прадпрыёмстваў у савгасах Завалочыцы, Бацэвічы, Ціхінічы і калгасах Расьсьвет і Эмэс. Ува ўсіх гэтых калгасах маюцца рухавікі, якія можна скарыстаць для электрыфікацыі. У частцы савгасаў і калгасаў ёсьць і дынама-машына.

Часовыя кантрольныя камісіі на заводах.

Гомель, 28-7. Згодна прапановы акрпрафсавету арганізуюцца часовыя кантрольныя камісіі на заводзе „Пролетарый", на сярніковай фабрыцы «Везувій» і 2 камісіі на чыгунцы і на пабудове новага сельска-гаспадарчага заводу.

Праверка працы па каапэраваньні беднаты.

Бабруйск, 28-7. З прычыны таго, што на мясцох зазначаецца няправільнае скарыстаньне фондаў каапэраваньня беднаты ў спажывецкай каапэрацыі, акрсаюз цяпер прыступіў да сталай праверкі правільнасьці скарыстаньня гэтага фонду і вывучэньня сацыяльнага стану каапэраванага за кошт фонду насельніцтва.

Бяз біржы працы.

Ворша, 28-7. У сувязі з разьвіцьцём будаўнічага сэзону, які з кожным днём усё шырэй і шырэй разгортваецца, гаспадарчыя органы досыць часта абыходзяць біржу працы пры ўкамплектаваньні рабочай сілы розных работ.

Па праведзенай зараз праверцы аказалася, што 6 вучастак Службы Цягі МБВ на біржы працы ўзяў 100 чалавек, а працуе ў яго каля 200 чал., а 3 вучастак будаўнічых работ канторы МБВ узяў 400 раб., а працуе каля—500 чалавек.

Дзе прафэсыянальныя саюзы і кулы яны глядзяць?

Абслугоўваньне рабочых у выхадныя дні.

Ворша, 28-7. Для лепшага абслугоўваньня рабочых застрахаваных, акркамітэт страхкасы ўстанавіў дзяжурствы ў выхадныя дні з 11 да 13 гадзін. Таксама для лепшага абслугоўваньня беспрацоўных дапамога выдаецца на самай біржы.

Культурную працу неабходна наладзіць

Дакудава—вёска досыць вялікая. Налічвае 92 двары. Клясавы склад насельніцтва неаднолькавы. Ёсьць беднота, ёсьць і заможныя гаспадары. Адна частка вёскі—былая шляхта; другая—мужыкі. Даўнейшыя клясавыя супярэчнасьці ня сьцёрліся і цяпер. «Шляхта» жыве і гаспадарыць асабняком. Беднота не арганізавана. Заможная частка больш арганізавана. У палітычным жыцьці адыгрывае больш- [illegible] волю. [illegible] прычыны мала- [illegible] арганізацыйнае [illegible] ніся беднаты альбо застаюцца па-за школай, альбо вучацца ў ёй год-два. Зразумела, што аб прасоўваньні ў сямігодкі і далей ня можа быць і рэчы.

Ліквідацыі няпісьменнасьці ў вёсцы не вядзецца.

Няма бібліятэкі, няма чырвонага кутка, няма ніякіх грамадзкіх арганізацый, няма ніводнага партыйца ці камсамольца. Масавай культасьветнай працы зусім ніякай не вядзецца. Ня дзіва, што вёска заліваецца самагонам. Ня дзіва, што не арганізавана беднота. Ня дзіва, што бядняцкая частка скардзіцца на перагі нібы меўшых мета ў вёсцы «хітрыкаў», аб якіх вя- [illegible] ВК

Як павінна праводзіцца кантрактацыя.

(Дырэктыўны ліст Наркамгандлю СССР).

За подпісам тав. Мікояна, усім наркамгандлям і гандлёвым аддзелам разасланы дырэктыўны ліст аб кантрактацыі пасеваў зернавых культур у асеньнюю пасяўную кампанію 1928 году.

У лісьце зазначаецца, што кантрактацыя зьяўляецца мерапрыёмствам вялікага народна-гаападарчага значэньня. За пяцімільённай праграмай кантрактацыі азімых пасеваў паявіцца яравая, якая, як відаць, будзе намі павялічана амаль у два разы.

З правядзеньнем гэткага буйнага мерапрыёмства мы ўжо троха спазьніліся, бо да пачатку асеньняй пасяўной кампаніі нам застаўся вельмі кароткі тэрмін.

Таму праца па правядзеньні пляну кантрактацыі павінна стаць у цэнтры ўвагі ўсіх мясцовых органаў і павінна быць выканана ў тэрмін.

Кантрактацыя праводзіцца выключна праз сельска-гаспадарчую каапэрацыю на аснове дагавору між Саюзхлебам і рэспубліканскімі цэнтрамі сельска-гаспадарчае каапэрацыі. Апарат Саюзхлеба і яго матар'яльныя магчымасьці павінны быць цалкам выкарыстаны для забясьпечаньня пасьпяховага ходу кантрактацыі азімых пасеваў. Наркамгандаль, усе яго мясцовыя органы, а таксама партыйныя і савецкія арганізацыі павінны аказаць дапамогу сельска-гаспадарчай каапэрацыі. Увага шырокае рабочае і сялянскае грамадзкасьці павінна быць згуртавана на гэтым мерапрыёмстве.

Мясцовым гандлёвым аддзелам неабходна:

1) у тэрміновым парадку прапрацаваць з мясцовымі эморганамі і саюзамі сельска-гаспадарчае каапэрацыі плян, зацьверджаны Наркамгандлю для іх райёну, і ўстанавіць акруговыя і парайённыя пляны;

2) прасачыць, каб саюзамі сельска-гаспадарчае каапэрацыі неадкладна былі дадзены цьвёрдыя заданьні па выкананьні намечаных плянаў па сваёй сыстэме;

3) устанавіць сталы нагляд за свечасовым прасоўваньнем крэдытаў на кантрактацыю аж да пасеўшчыкаў і за свячасовым падпісаньнем дагавораў з пасеўшчыкамі.

Выбар групы гаспадарак, з якімі падпісваецца кантракт, і выдача авансаў ні ў якім выпадку ня можа праводзіцца шляхам разьвёрсткі па пэўных райёнах. Трэба праводзіць гэта такім чынам, каб забясьпечыць найбольшы гаспадарчы эфэкт—пашырэньне пасеваў і падняцьце ўраджайнасьці. Таму пры разьбіўцы плянаў кантрактацыі па райёнах, асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на тыя райёны, якія маюць большую колькасьць нявыкарыстаных земляў і маюць большыя магчымасьці ў сэнсе пашырэньня пасеваў.

Неабходна ўкараніць у шыро- [illegible] лы сялянства разуменьне значэ- [illegible] чыстагатунковага насеньня для справы падняцьця ўраджайнасьці.

У паўднёвых райёнах у бягучую кампанію мы раздаём сялянам больш 15 млн. пуд. насеньня. Гэты насенны фонд павінен быць выкарыстан для забясьпечаньня праграмы кантрактацыі. У райёнах, дзе сялянства забясьпечана насеньнем і дадатковая дастаўка насеньня не ўваходзіць у плян, неабходна дапамагчы сялянам у сартыроўцы і пасеве палепшанага і ачышчанага зярна.

Умовы дагавораў з зямельнымі таварыствамі і групамі гаспадарак павіны забясьпечыць гэтыя гаспадаркі больш льготнай дастаўкай неабходны- [illegible] ламі вытворчасьці і арганізацыі [illegible] ічнай дапамогаю ў [illegible] выдалі-б прызвы- [illegible] ых райёнаў і [illegible] права- [illegible] вы-

ючы ў дагаворы пункты аб ужываньні машын пры апрацоўцы ў гаспадарках, і там, дзе мы ня маем адпаведных рэсурсаў.

З тае прычыны, што збытавая кантрактацыя злучаецца з вытворчай, неабходна ў вытворчай частцы дапасоўваць усе пляны і ўмовы дагавораў з НКЗ рэспублікі і іх вабласнымі і акруговымі органамі і забясьпечыць іх дапамогу ў правядзеньні ўсёй гэтай кампаніі. У райёнах кантрактацыі трэба дамагчыся праз органы НКЗ максымальнага выкарыстаньня аграномічных сіл для правядзеньня катрактацыі і вытворчых умоў, уключаных у дагавор.

Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на разьмеркаваньне авансаў сярод пасеўшчыкаў. Павінна быць забясьпечана найбольшае спрыяньне бядняцкім пластом вёскі. Пры гэтым неабходна растлумачыць, што кантрактацыя зьяўляецца вытворчай дапамогай, якая аказваецца на пачатках аванскіраваньня, крэдытаваньня і прыняцьця на сябе пасеўшчыкамі дакладна агаворанага умоў, выкананьне якіх зьяўляецца абавязковым.

Таму праз сельсаветы, сялянскія грамадзкія арганізацыі і пры ўдзеле ўсяго вясковага актыву шырока павінен быць пастаўлен кантроль над тым, наскольки выкарыстанае пасеўшчыкамі выдадзеных ім авансаў адпавядае абавязацельствам у мэтадах апрацоўкі і ўжываньня агратэхнічных мерапрыёмстваў, абумоўленых кантрактам.

Пры правядзеньні катрактацыі і заключэньні дагавораў неабходна розным чынам выкарыстаць усе моманты, якія могуць дапамагаць арганізацыі зернавых аб'яднаньняў. У адпаведнасьці з гэтым дагаворы на катрактацыю заключаюцца з цэлымі зямельнымі таварыствамі, вытворчымі аб'яднаньнямі і групамі пасеўшчыкаў, а не з асобнымі гаспадаркамі. Агульная ўвага павінна быць зьвернута на дастаўку сялянам чыстагатунковага і палепшанага насеньня, бо найбольшую эфэктнасьць гэтая мера можа даць пры ўмове, калі ёю ахапляецца цэлы райён, а таксама дастаўку праз кантракты розных сельска-гаспадарчых машын, асабліва складаных-малатарняў, трактараў і інш. уборачных машын на больш ільготных умовах.

Шырока папулярызуючы кантрактацыю, як мерапрыёмства, якое павінна хутка падняць прадукцыйнасьць сялянскае гаспадаркі, павялічыць яе ўраджайнасьць, неабходна разам з тым усіляк растлумачыць сялянству, што посьпех кантрактацыі можа быць забясьпечан толькі пры ўмове, калі заключыўшыя дагаворы будуць выконваць усе прынятыя імі на сябе абавязацельствы як па здачы ў вызнача- [illegible] мін дагаворнае колькасьці зярн- [illegible] і датычачыя ачышчанага насеньня, парадку апрацоўкі глебы і правядзеньня ўсіх заспачаных ім агратэхнічных указаньняў.

У кампанію па кантрактацыі неабходна самым шырокім чынам выкарыстаць друк і асабліва сетку карэспандэнтаў цэнтральных і мясцовых газэт на мясцох. Друк павінен асьвятляць ход мерапрыёмстваў па кантрактацыі правільнасьць і мэтазгодвасьць разьмеркаваньня авансаў, парадак і свечасовасьць прасоўваньня крэдыту і ўсіх іншых момантаў, зьвязаных з працаю па правядзеньні пляну.

Заключэньне дагавораў і выдача авансаў павінна быць скончана ў ЦЧО і ўсходніх райёнах да 20-га жніўня, у Сярэдня-Волскім райёне да 25-га жніўня, у Ніжня-Волскім і паўднёвых райёнах—1-га верасьня. Мясцовыя органы павінны мабілізаваць усе сродкі, якія далі-б магчымасьць правесьці кантрактацыю ў тэрмін.

Адказнасьць за свечасовае правя- [illegible] заданьня па кантрактацыі [illegible] ца персанальна на наркан- [illegible] ублін і кіраўнікоў іх ма- [illegible]

Праверка—самакрытыка—кантроль мас.

Каменны бюракратызм.

На пляцу Вільчанскай школы сялянскай моладзі ў свой час быў разабраны належачы Койданаўскаму РВК будынак і перададзен дзіцячай калёніі.

А можа і ня так, можа наперад быў перададзен, а потым ужо разабраны... Справа ня ў гэтым, а ў тым, што ад гэтага будынку застаўся падмурак, правільней кажучы, каменьні ад апошняга.

Вось пра гісторыю з гэтымі каменьнямі мы і будзем гаварыць. Як і па ўсім Саюзе Савецкіх Рэспублік, у Койданаўскім раёне праводзілася сёлета сялянамі самаабкладаньне на гаспадарчыя і культурныя патрэбы свайго раёну, сваіх вёсак.

Сяляне вёсак Лапцэвічы, Жылічы, Грычына і некаторы хіншых—пастанавілі на сродкі самаабкладаньня пабудаваць будынак для сваёй школы.

Рэч добрая і яе трэба толькі вітаць. На гэты пункт погляду стаў і Койданаўскі райвыканком, які, нават, рашыў дапамагчы сялянам у пабудове школы і дазволіў ім скарыстаць каменьні ад разабранага будынку.

Раз дазвол ёсьць, дык вельмі дружна ўзяліся сяляне за агульную справу:—прышлі калектывам, выкапалі каменьні і нават зложылі іх у штабелі. Праца, як бачыце, ня лёгкая, але сяляне радаваліся, што будзе ў іх своя добрая школа.

Сяляне радаваліся, а ў гэты час загадчыца Вільчанскай школы сялянскай моладзі т. Буклей сядзела ў сваім пакоі і, усьміхаючыся, разважала:—вам райвыканком дазволіў, а паперкі ня даў, ну дык вы ў мяне пагуляеце за каменьнямі...

Праз некалькі дзён прыехала за каменьнямі каля 20 сялянскіх падвод, але загадчыца ўпёрлася—і ні з месца. Адным словам, не дазволіла сялянам узяць гэтыя «вельмі каштоўныя» каменьні.

Паспрачаліся сяляне, але што зробіш з начальствам? Так і паехалі ні з чым.

На другі дзень прыехала другая партыя сялян—больш настойлівых.

Спрачаліся і гэтыя з пару гадзін, але дахаты прышлося ехаць паражняком...

Сяляне нашы аказаліся ўпартымі і ў наступны раз прыехалі з старшынёй сельсавету, але загадчыца аказалася ўпартай жанчынай,—не дапамог, як кажуць, і прадстаўнік высковай улады.

Аднак, сяляне цьвёрда рашылі будаваць школу, а таму не застанавіліся на адных штодзённых спрэчках з грамадзянкай Буклей і накіравалі дэлегацыю ў райвыканком. У райвыканкоме зараз-жа далі сялянам паперку да загадчыцы, у якой далікатна просяць адпусьціць сялянам каменьні.

Прыехалі нашы сяляне з паперкай да загадчыцы...

— Ага, просяць! Ну дык зараз!

Калі ласка можаце брацы!

Такім чынам, дзякуючы бяздушнаму фармалізму загадчыцы школы сялянскай моладзі, сялянам прышлося патраціць шмат рабочага часу, а разам з тым сяляне нараз, відаць, дзякавалі гр. Буклей за «ўважлівыя» да іх адносіны.

Не зашкодзіць, калі за высьвятленьне гэтай справы возьмуцца таксама ўважліва належныя органы, бо каменьні валяліся бяз толку не адзін год, і загадчыца добра ведала, што каменьні гэтыя адпушчаны сялянам для будаўніцтва школы.

Дружная пара.

Настаўнік Шаршунскай школы, нехта Гураў, лічыцца ў нашага Заслаўскага «начальства» выдатным пэдагогам і нават актыўным. Вядома, другі настаўнік ніколі ня зможа так зрабіць, як Гураў. Так, будучы летась у Сярэднянскай школе, Заслаўскага раёну, Шаршунскага с.-с., Гураў займаўся з дзецьмі ў працягу навучальнага году ня больш як 50—60 дзён. Увесь астатні час ён правёў у Менску—усё лячыў хваробы. І рабіў паездкі на па 7—15 дзён. Калі-ж сяляне запытаюць у свайго настаўніка, якая гэта ў яго хвароба, дык Гураў адказвае ўсякі раз інакш: адзін раз скажа, што ў яго катар страўніка, другі раз—катар кішок, там горла, там раматус, сухоты касьцей і інш.

Сяляне, паглядаючы, як іх дзеці [illegible] па вуліцы [illegible], цяжка ўздыхаюць ды кажуць: «А ліха яго ведае, што наш за настаўнік і са ўсяго сьвету сабраліся ў яго хваробы і як ён, бедны, толькі іх пераносе».

А каб пакрыць свае паездкі, Гураў заліваў гарэлкаю горла старшыні Шаршурскага с.-с., Старадуба. А каб сялян супакоіць, Гураў гады-сяды зробіць спэктакль, а то вечар спайкі—спойкі, дзеля якога ў школе пад відам кваску пагоняць самагонкі, ды п'янствуе моладзь разам з Гураўым і старшынёй с.-савету Старадубам. Гаралка рабіла сваю справу і Гураў спакойненька вешаў замок на дзьвярох школы ды ехаў у Менск на тыдні два.

А каб паказаць перад інспэктарам, што і ён працаваў, ён прывёў на экзамен некалькі вучняў, якія нічога ня ведалі. Нават простых рэчаў ня ведаюць дзеці, напрыклад для чаго сонца лён, што такое рака, плыты, дзе на карце Беларусь, Менск, Масква, мора і інш.

Падобнае зьявішча нагадалася з вучнямі ягоі сёлета.

[illegible] Гураў [illegible] добра ўнес чарніц, аблівацъ грязьзю другіх настаўнікаў, выхваляючы сябе. Вядома, Старадуб, як таварыш Гурава па бутэльцы дапамагае яму ў плётках. Так, яны напалі на настаўніцу Панюціну і стараюцца яе зьесьці.

Я не абараняю Панюцінай, але скажу, што раней трэба было-б пагнаць вон Гурава і старшыню с.-с. Старадуба, а тады і Панюціну.

С.

20 проц. зьніжэньня выдаткаў—пад кантроль працоўных.

Прэзыдыум ЦСПСБ даў дырэктывы прафсаюзам узяць пад увагу вопыт праведзенай масавай праверкі фактычных выдаткаў і 20 проц. зьніжэньня адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў з гакім разрахункам, каб чарговая праверка фактычных выдаткаў за ўвесь бягучы гаспадарчы год была праведзена пры большым уцягненьні мас рабочых і служачых.

Разам з тым прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў павялічыць жывое кіраўніцтва і інструктаваньне нізавых ячвек, справаздачы якіх аб праробленай працы будуць пэрыядычна заслухоўвацца на пасяджэньнях прэзыдыуму ЦП саюзаў.

Рабочыя і служачыя будуць прыцягнуты да абгаварэньня каштарысаў на наступны год.

Дадзена таксама ўказаньне аб тым, каб кіраўнікі ўстаноў і прадпрыёмстваў сумесна з саюзнымі арганізацыямі ўзмацнілі працу па рацыяналізацыі, асабліва ў галіне спрашчэньня вучоту і рахункаводзтва.

Саюзным арганізацыям неабходна будзе наладзіць сыстэматычны кантроль за выкананьнем каштарысаў і своечасова паведамляць органы РСІ аб нягрунтоўным перавышэньні расходаў, якія вызначаны каштарысамі. Трэба таксама даводзіць да ведама РСІ і аб невыкананьні дзелавых прапаноў рабочых і служачых накочт далейшага зьніжэньня выдаткаў.

Курам на сьмех.

Нашы газэты праз увесь час не пакідаюць крычаць, што пошта вельмі марудна і неахвотна беларусізуецца, што ў паштовых установах заўсёды стрэнеш шмат кур'ёзаў з беларусізацыяй. Увойдзеш у памяшканьне якое-небудзь паштовае ўстановы, а там на сьцяне вісяць розныя дошчачкі з надпісамі «пабеларуску», але і сьмех і бяда—цяжка зразумець, адкуль гэта бярэцца такая мова, як, здаецца, не пачырванець ад сорану за такія надпісы. Усё-ж прадаўнікі паштовых устаноў не чырванеюць, хоць аб вывучэньні беларускае мовы было ўжо шмат дырэктыў як партыйных, так і савецкіх органаў, а і да гэтага часу яны «пацяшаюць» нас рознымі кур'ёзамі.

Вось, напр., гэтымі днямі беларускае кіраўніцтва сувязі выпусьціла свой «твор»—«Сьпіс абанэнтаў гарадзкіх тэлефонных сетак Менскае акругі сувязі». Як толькі возьмеш у рукі гэты «Сьпіс абанэнтаў», дык проста валасы дыбам становяцца. Такая тут «чысьцюсенькая» беларуская мова, што дзіву дасешся. Як гэта за такі «кароткі тэрмін» ды такія «вялікія» посьпехі ў гэтай установе ў галіне беларусізацыі? Ужо на вокладцы крычаць такія «ўзоры» як «Усі увагі, якія датычуцца карыстаньня гэтым сьпісам, просьба певедамляць тэлефоннай сетцы», а калі разгорнеш першую старонку, ды заглянеш крыху глыбей, дык і ліку няма тым недарэчнасьцям і памылкам, якімі стракацяць гэтыя старонкі. Тут табе і «адчотліва», і «будце», і «пастаронніе», і „папсуцьцёў», і «дзейства», і «пляту» (людзі думаюць, што гэта «пляту лапці», аж трэба чытаць «абанэнтную плату»), і «разрэгуліроўваецца», і «расчуліць умову» (мусіць скасаваць умову) і «ўзыскаць», і «па вастанаўленьню дзейства», і „састаўленьня" і «падчыняцца" і многа, многа інш. Ці-ж ня праўду я казаў, што валасы дыбам становяцца? Але што-ж ты зробіш з паштавікамі, калі „ўмовы расчуліліся", а яны, небаракі, у гэтых умовах зусім сплываюць сьлязьмі. Можа іх «пашкадуюць» тыя ўстановы, якія ведаюць гэтай справай. А ёсьць за што «пашкадаваць».

К.

КАПРЫЗЫ Д-РА МАКАРЭВІЧА.

Як толькі прыехаў у Буцэвіцкую больніцу (Заслаўскі раён) новы загадчык Макарэвіч, усе парадкі перамяніліся: Макарэвіч прыняў позу строгага і грубага адміністратара, пайшлі склові, непарады, грубыя адносіны да хворых...

Адным словам, Макарэвіч адразу паказаў „сваю начальніцкую веліч", і калі служачы ня так скажа слова, то Макарэвіч перш за ўсё стукне па сталу кулаком, сашчэпіць зубы і сярдзіта скажа: «Я тебя сейчас-же снимаю с работы». Праўда, былі ў Макарэвіча і «сыночкі», з якімі ён ладзіў.

1-га мая б. акушэрка Рак у больнічным памяшканьні (дзе ляжаць хворыя) зрабіла вечар з танцамі і сьпевамі.

Пачалі пёць, гуляць...

Для гэтага вечару забралі ўсю мэблю, нават з прыёмнай. Якраз у гэту ноч прывезьлі хворую гр-ку Крэсік і яе прышлося палажыць на голую падлогу.

Некаторыя служачыя былі абураны такімі парадкамі, і зьвярнуліся да Макарэвіча які ім аўтыярэтна адказаў. «Не ваше дело, я сам разрешил устроить этот вечер, и если вы будете вмешиваться в мои порядки—всех разгоню».

Макарэвіч чалавек далікатнай натуры—любіць можны тыдзень [illegible] то ў Менск, то да свае жонкі, і амаль кожны тыдзень па 2-3 дні ня бывае ў больніцы. Прымае хворых толькі адзін фэльчар Гуліс.

Над вартаўніком Руткоўскім Макарэвіч яўдзекваецца, відае яго направа і налева, ганяе куды трэба і ня трэба, абяцаючы за гэта «устроіць» яго жонку.

А калі Руткоўскі пачынае супярэчыць, то Макарэвіч абвяшчае яму вымовы. Таксама адносіўся Макарэвіч і да санітарак.

Гэта пра д-ра Макарэвіч ня ўсё. У яго прасачваецца і антысэмітызм. У часе службовых заняткаў перад людзьмі, Макарэвіч лаяў зубурача Эйдэльман, і гаварыў на яе-„жыдоўка, вам месца толькі на ніжнім рынку».

Былі і такія выпадкі, калі д-р Макарэвіч, едучы ў Менск ня браў падвесьці служачага, і гаварыў,—«вы ня маеце права езьдзіць». А як сам, дык ва ўсякі час езьдзіць да сваёй жонкі.

Макарэвіч любіў і спэкульнуць. У той час, калі не хватала хлеба, Макарэвіч выпісвае з Хлебапрадукту 2 мяшкі мукі для харчаваньня хворых. Адзін мяшок мукі Макарэвіч заставіў для хворых, а другі аддаў селяніну Сідорыку, які спэкуліраваў гэтай мукой.

З. Таганскі.

Заплакалі грошыкі.

У Мазыршчыне ёсьць мястэчка Капаткевічы, а ў гэтым мястэчку—каапэратыў, які да 1926 г. вельмі добра працаваў пад кіраўніцтвам старшыні праўленьня Кватко́ўскага. Было відаць, як каапэрацыя мацнее, змагаецца з прыватнымі гандлярамі.

У 1926 г. Мазырскі райсаюз, каб падняць больш адсталы каапэратыў у м. Жыткавічах, перакінуў туды т. Кватко́ўскага, а з апошняга зьнаў т. Іванова і прыслаў у Капаткевічы.

Стаў працаваць т. Іваноў і за невялікі час утаргаваў у сваю кішэню 2000 руб. ды пашоў на адпачынак у Мазырскі Допр.

Як засудзілі Іванова, дык на яго месца быў прысланы нейкі Аляксеў. Стаў працаваць і гэты каапэратар, купляў, прадаваў, піў, гуляў і ніхто як быццам ня ведаў, нават райком і РВК.

Праўда, прыяжджаў зноў той самы інструктар Трымайлаў з райсаюзу, які праверыў працу пасямейнаму і заўважыў у Аляксеева недахопу ўсяго 29 руб., а што заўважана было больш, як падробленых дакумантаў на значную суму, ну, дык Трымайлаў адказаў, што гэта будзе аформлена.

Працаваў так Аляксеў і далей і як сабралася ў Аляксеева за кішэ[illegible] каапэратыву 4060 руб. ды стала вусім пустая крама, дык тут заганаілі, зноў прыехаў на рэвізію Трымайлаў, які вывіў усе грошыкі. І на гэты раз Трымайлаў ня ўстрымаўся.

— Ну, што-ж, трэба і Аляксеева адправіць у дом адпачынку. Але, якжа яго заарыштаваць такога добрага чалавека. Тут Трымайлаў распарадзіўся даць яшчэ т. Аляксееву за паўмесяца пэнсію, каб было з чым уцячы і сказаў, што ён яго павязе ў Мазыр для высьвятленьня недахопаў, і як толькі міліцыя хацела арыштаваць, дык і райком заступіўся. Павёз Трымайлаў Аляксеева на ст. Калінкавічы, дзе яны разьвіталіся і Аляксеў там скінуўшы шапку падзякаваў за ўслугі і даў цуба, нават з партфэлем, шубай, нажніцкай і валенкамі.

РВК і райком цяпер адбудзіўся, ускладае віну па служачых каапэратыву за тое, што яны нічога не гаварылі пра прадзелкі Аляксеева, а яны ў баку, як быццам нічога ня ведалі, а толькі бачылі.

Трэба прыслаць добрага сьледчага, каб уняў за бокі ўсіх і нават сьляпую рэвізійную камісію т-ва.

Ёрш.

У Савеце Народных Камісараў Беларускай ССР.

На апошнім пасяджэньні СНК былі разгледжаны наступныя пытаньні:

КАШТАРЫС НА МЭЛІАРАЦЫЙНЫЯ РАБОТЫ НА 1928-29 Г.

У зьвязку з аграрнай перанасельнасьцю ў БССР за апошнія часы значна пашыраюцца мэліарацыйныя работы, праз якія ўдзяваюцца ў сельскагаспадарчы зварот раней няўдобныя землі. Аб росьце мэліарацыйнага будаўніцтва сьведчыць тое, што ў 1926-27 г. самым насяленьнем было ўкладзена па БССР 662 тыс. руб., а ў 1927-28 г. 1.352 тыс. руб. або рост у 2 разы. На будучы год ёсьць падставы чакаць такога-жа росту.

У зьвязку з такім значным ростам НК Земляробства БССР на 1928-29 г. мяркуе значна павялічыць выдаткі на мэліарацыйныя работы і выдаткаваць па сваёй лініі каля 3,987 тыс. руб.

За кошт гэтых сродкаў мяркуецца рэгуляваць 19 рэк, даўжынёю 232 клм. і выняць каля 1 млн. куб. мэтраў. У выніку гэтых работ мяркуецца асушыць плошчу ў 60 тыс. гэкт. Звыш таго мяркуецца, што насельніцтва адрэгулюе 23 клм. з выймкай у 32 т. куб. мэтраў.

Апроч таго, вызначаецца капітальны рамонт 147 клм. каналаў, пабудаваных да вайны і бягучы рамонт 400 клм. каналаў. Рамонт каналаў ахопіць плошчу у 30 тыс. гэкт. і будзе асушана 4 з пал. тыс. гэкт. Апроч таго, вышуканьнямі будзе ахоплена коля 200 тыс. гэкт.

Наогул паводле прапановы НК Земляробства мэліарацыйныя работы ў будучым годзе павінны значна павялічыцца.

Савет Народных Камісараў прыняў да ведама, што НК Земляробства падана заяўка для правядзеньня ў БССР у 1928-29 г. мэліарацыйных работ на суму 3.987,1 тыс. р., з якіх 3.088,8 беззваротных.

Аб'ём мэліарацыйных работ СНК у асноўным прыняў, прычым канчатковае зацьвярджаньне каштарысу пастаноўлена зрабіць пры канчатковым зацьвярджаньні апэрацыйнага пляну мэліарацыйных работ.

Разам з гэтым СНК запрапанаваў НК Земляробства пры складаньні вытворчага пляну па мэліарацыі на 1928-29 г. пэўна вызначыць, якую іменна работу і ў басейнах якіх рэк будзе рабіць насельніцтва, больш поўна апрацаваць пытаньне аб тэхнічным пэрсанале, мяркуемых агульных досьледах, апрацаваць пытаньні аб скарыстаньні асушаных зямель і аб падрыхтоўцы для землянадзяленьня і засяленьня, а таксама прадугледзець суму на арганізацыю вопытнай справы па гідратэхніцы і культуртэхніцы.

АБ ВІДАХ НА ЎРАДЖАЙ.

Саветам Народных Камісараў было заслухана інфармацыйнае паведамленьне Цэнтральнага Статыстычнага Кіраўніцтва аб відах на ўраджай.

З прычыны няспрыяючых мэтэаралёгічных умоў становішча пасеваў вясною некалькі пагоршылася, прычым на захадзе гэта пагоршаньне больш, а на ўсходзе Саюзу наадварот становішча пасеваў лепшае, як у мінулым годзе.

У зьвязку з устанавіўшымся ў апошнія часы добрым надвор'ем становішча пасеву ў БССР некалькі палепшылася, і калі надвор'е будзе заставацца лепшым да ўборкі хлябоў, то ў агульным ураджай ня будзе значна ўступаць ураджаю мінулага году.

Так, азімая рож у мінулым годзе на 1-е ліпеня ацэньвалася ў 2,9 бала (сярэдні ўраджай), на 1-е ліпеня г.г.—у 2,6 бала, а на 15-ае ліпеня г.г. мы маем павялічэньне на 0,1 бала, г. зн. 2,7 бала.

Становішча ячменю на 15-е чэрвеня ацэньвалася ў 2,7 бала, на 1-е ліпеня яно пагоршылася да 2,2, але цяпер зноў палепшылася да 2,4 бала.

Авёс на 15-е ліпеня ацэньваецца ў 2,5 бала.

Ацэнка бульбы на 15-е чэрвеня складае 2,1 бала, але на 15-е ліпеня павялічылася да 2,3 бала. У далейшым магчыма, што становішча пасеваў бульбы яшчэ некальні палепшыцца і ўраджай гэтага году будзе на горш ураджаю мінулага году.

Становішча пасеваў льну на 1-е ліпеня мінулага году ацэньвалася ў 2,3 бала, у гэтым годзе ў 2,2 бала, але за апошні час становішча пасеваў лёну значна палепшылася і на 15 ліпеня мы ўжо маем ацэнку ў 2,4 бала. Значыць па лёну становішча ўраджаю лепшае, як у мінулым годзе. Паводле ацэнак можна прыблізна вылічыць агульны збор збожжавых хлябу у 92 млн. пудоў і толькі, калі становішча ўраджаю не палепшыцца, ён будзе крыху (проц. на 2) ніжэй за ўраджай мінулага году. Ураджай траў увогуле ня ніжэй ураджаю мінулага году.

Савет Народных Камісараў, заслухаўшы гэтую інфармацыю, адзначыў, што няспрыяючыя мэтэаралёгічныя ўмовы выклікалі перасеў азімых культур, а балавая ацэнка пасеву панізілася супроць мінулага году. Але пачынаючы з ліпеня, у зьвязку з палепшаньнем надвор'я, палепшылася і становішча пасеваў.

СНК прыняў да ведама паведамленьне ЦСК, што па папярэдніх даных у бягучым годзе павялічылася агульная пасеўная плошча за лік павялічэньня жыта і лёну.

СНК таксама даручыў НК Гандлю і Земляробства вывучыць пытаньне аб прычынах значнага продажу па танных цэнах жывёлы на рынку і даручыў далажыць аб гэтым СНК.

СНК даручыў кіраўніку ЦСК тав. Праферансаву асьветліць у друку віды на ўраджай.

БОЛЬШ УВАГІ СПРАВЕ ЭКСПАРТУ.

(Гутарка з Нар. Кам. Гандлю тав. Адамайцісам).

Заграничны рынак цікавіцца нашай сыравінай, але мы яшчэ ня вывучыліся экспартаваць...—Шырокія магчымасьці для разьвіцьця экспарту другараднай сыравіны.

— Асноўнай мэтай маёй паездкі заграніцу было вывучэньне пытаньня экспарту і выяўленьне магчымасьці разьвіцьця новых відаў экспарту. За час паездкі я пабываў у Польшчы, Нямеччыне, Чэха-Славакіі, Літве і Латвіі. За межамі я вёў па цікавячых мяне пытаньнях перагаворы з рознымі спэцыялістамі нашых гандлёвых прадстаўніцтваў, з прадстаўнікамі розных фірм і каапэрацыі; абгледзеў склады з экспартнымі таварамі як нашымі, так і іншых краін, а таксама партовыя склады [illegible] прадпрыемствы.

МЫ МАЛА ДУМАЕМ АБ ЯКАСЬЦІ ЭКСПАРТУ.

Раней за ўсё трэба адзначыць, што прыглядваючыся заграніцай к нашым экспартным таварам і раўнаючы іх з такімі-ж іншых краін, асабліва відалася ў вочы наша старая агульная хвароба: недахопы якаснага боку нашага экспарту; часта выяўляецца незахаваньне стандартаў, недахопы на ўпакоўцы і сартыроўцы тавару і інш.

У нас не прыдаюць аначэньня пытаньням сартыроўкі і ўпакоўкі ў той час, як заграніцай гэтыя пытаньні стаяць настолькі сур'ёзна, што часта экспартны тавар добрай якасьці абясцэньваецца і яго цяжка рэалізаваць толькі таму, што тара, у якой ён прыбыў, не адказвае устаноўленаму стандарту. Бывалі выпадкі, што нашы тавары прыходзілася заграніцай перасартыроўваць, з прычыны чаго паніжалася каштоўнасьць тавару.

Як напрыклад няўважлівых адносін да экспарту, можна ўказаць на наступнае.

БССР у адносінах экспарту смалапрадуктаў займае досыць віднае месца. Мы па гэтых прадуктах даём 40 проц. агульнасаюзнага экспарту і да 10 проц. усясьветнага. Смалапрадукты БССР па якасьці досыць высокія, але тара (бочкі), у якой накіроўваецца тавар, вельмі далёка адстае ад ўстаноўленага стандарту, а таму і рэалізацыя тавару часта ўскладняецца, ня кажучы ўжо аб тым, што нашы арганізацыі нясуць досыць значныя расходы па рамонту прыбываючай заграніцу тары. У некаторых выпадках нават прыходзіцца пераліваць заграніцай нашу смалу ў стандартную тару.

[illegible] таму зараз мы павінны будзем асабліва завастрыць увагу ня толькі на далейшым павялічэньні нашага экспарту ў якасных адносінах, але прыняць усе меры да палепшаньня якасьці тавараў. Уздымаючы якасьць нашага экспарту, мы тым самым павялічым рэнтабельнасьць яго.

НОВЫЯ ВІДЫ ЭКСПАРТУ.

В новых відаў экспарту, якіх БССР дасюль ня вывозіла ці вывозіла ў нязначнай колькасьці, намі былі вывучаны пастуныя:

Група прадуктаў жывёлаводзтва:—косьці, рогі, рагавая стружка, капыты, кравяная мясная мука і іншыя адкіды. Уся гэта група тавараў мае заграніцай досыць вялікі попыт. Экспарт гэтых відаў сыравіны ў сучасны момант з БССР толькі пачынаецца. Дасюль у большасьці выпадкаў гэтыя прадметы ў нас рацыянальна не скарыстоўваліся, а часта гінулі даремна.

Трэба таксама адзначыць, што з коняй мы толькі скарыстоўвалі скуру, а рэштай харчаваліся вароны. Заграніцай-жа з гэтых адкідаў вырабляюць вельмі каштоўныя прадукты: тэхнічны тлушч, мясную і касьцяную муку, якія могуць быць скарыстаны ня толькі на савецкім, але з посьпехам і на заграніцным рынку.

БАГАТЫЯ ПЭРСПЭКТЫВЫ ЭКСПАРТУ ЦЫБУЛІ І ІНШ. ГАРОДНІНЫ.

Наступнай групай экспартных тавараў зьяўляюцца прадукты гародніцтва. Заграніцны рынак, асабліва нямецкі, імпартуе аграмадную колькасьць прадуктаў гародніцтва. Досыць указаць, што толькі адна Нямеччына ўвозіць штогод каля 4000000 пудоў цыбулі: увозіцца таксама шмат каляровай капусты, морквы і інш. гародніны.

БССР па сваіх геаграфічных умовах можа з посьпехам транспартаваць сьвежую гародніну і за рахунак апошняй значна пашырыць наш экспарт. Вось чаму трэба зьвярнуць увагу нашых багатоўчых арганізацый на загатоўку гародніны для экспарту, а таксама фарсіраваць разьвіцьцё гародняй гаспадаркі, асабліва ў мястэчках, дзе спэцэфічныя ўмовы могуць спрыяць гэтай справе.

Што-ж датычыцца цыбулі, дык трэба аддаць ёй асаблівую ўвагу; трэба ня толькі ўзмацніць загатоўку цыбулі, але ў наступным годзе выпусьціць, як праект, кантрактацыю яе пасеваў дзеля пашырэньня апошніх.

НАШЫ ФРУКТЫ ЗНОЙДУЦЬ ЗБЫТ ЗАГРАНІЦАЙ.

Да вайны Беларусь мела наладжаны збыт фруктаў і ягад на заграніччным рынку. У савецкіх умовах сёлета мы ўпэрыньню прыступаем да экспартаваньня гэтых прадуктаў. Нашы яблыкі напр. антонаўка, знойдуць рынак збыту. Праўда, яны ня могуць канкураваць з крымскімі фруктамі і фруктамі іншых краін, але ўсё-ж [illegible] шырока скарыстоўваць для розных тэхнічных мэт—варкі мармэляду на фабрыках цукерак і г. д.

Пытаньне транспартаваньня яблык урэгулявана: яны павінны грузіцца ў спэцыяльна абсталёваныя вагоны бяз тары. Нямецкія і літоўскія чыгуначныя арганізацыі будуць падаваць весі для перастаўкі нашых вагонаў на заграніччныя чыгуначныя шляхі.

Асабліва вялікі попыт заграніччны рынак выяўляе на чарніцы і брусьніцы. Чарніцы мы вывозілі ў сушаным відзе, але недастаткова, а брусьніцы яшчэ ня вывозілі. Між тым попыт на брусьніцы заграніцай аграмадны. Досыць сказаць, што адна Фінляндыя экспартуе ў Нямеччыну брусьніц на 1.000.000 руб. золатам.

Збор і загатоўку брусьніц трэба ўсімі мерамі разьвіць, тым больш, што да вайны з межаў Беларусі вывозілася 100—150 вагонаў гэтага тавару.

НА ШТО ЯШЧЭ ТРЭБА ЗЬВЯРНУЦЬ УВАГУ.

Жолудзі і каштаны таксама знойдуць збыт на замежных рынках, і сёлета нам неабходна пачаць загатоўку іх. Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на загатоўку воску і мёду. Трэба разгарнуць і загатоўку лексыравіны. У нашых загатоўчых арганізацый існуе думка, што заграніччны рынак гэтым таварам ужо насычан поўнасьцю, і што яе будзе цяжка збыць; гэта не адпавядае сапраўднасьці. Цяжка збыць толькі тое, што дрэнна апрацавана і адсартавана. Мы маглі-б вывозіць куды больш. На заграніччным рынку ёсьць попыт на аеравы корань, сушаныя лісьця крапівы, мяты і інш. лекавых расьлін, а асабліва інтарэс і попыт заграніца выяўляе на спарыньню, за якую плацяць па даляру за кілё.

Вялікую зацікаўленасьць заграніца выяўляе і да нашых выкапняў: крэйды, вохры і інш.

Апрача вывучэньня новых відаў экспарту, на якіх мы сабралі досыць падрабязныя матар'ялы, намі вывучаны пытаньні пастаноўкі птушніцтва, збору і сартыроўкі яек. Абгледжаны таксама халадзільнікі, бокоўныя фабрыкі і шэраг іншых прадпрыёмстваў, якія перапрацоўваюць прадукты сельскай гаспадаркі для экспарту.

НАТАТКІ ПРА УКРАІНУ*).

Праехаўшы другі, Сурскі парог, куды меншы за першы парог—Кадацкі, наш дуб ічыцца да наступнага, Лаханскага парогу. Хлопцы пасьмялелі—прапала ранейшая боязьнь...

— Ні табе пылу!..—голасна робяць заяву нашыя сябры, украінцы. А Вася Каваль перарывае:

— Ні табе беларускага, грязкага балота...

Наўпрыкмець пад'ехалі да Лаханскага парогу. Падхапіў струмень наш дуб, рванула ўніз, а праз якую хвіліну парог застаўся ззаду... Лаханскі парог—адзін з невялікіх парогаў, аднак, пры наўмелым кіраўніцтве дубам, пераплысьці парог небясьпечна, бо на парозе страшэнныя віры, і віраплынь можа павярнуць дуб бокам, а тады напорам вады і перакуліць...

— Захацелі два багатыры сілай памерыцца. Адзін наш быў, а другі—варожы. Як-жа сілу сваю зьмераць?. Параныл ўзяць па каменю і ўмовіліся, што хто з іх перакіне праз Днепр камень, той сілу большую мае... Кінуў камень наш багатыр—закінуў вунь куды—на другі бераг, а кінуў камень варожы багатыр—бачыце як, ледзь за сярэдзіну закінуў...

— Так, вось, і дазналіся ўсё, што мы сільнейшыя за ворага—апавядае нам лоцман Андрый Білокінь паданьне пра „Багатырэвы каміньня", а яны—два волаты—вялічэзныя горда высяцца на-пад Днепром, за Лаханскім парогам...

Бязлітасна паліць летняе, украінскае сонца. Якая яму справа да таго, што ў хлапцоў зачырванела скура з ліловым адценьнем...

— Ратуйцеся!—крычыць Усенко і момэнтальна ў ягоных руках сродак выратунку... вазэлін...

Блішчаць наваззліненыя насы...

— Зараз будзе Звонецкі парог,—сур'ёзна заяўляе лоцман. А чаму Звонецкі?—А таму, што ў ім утапілі звон... Так і да скончэньня сьвету будзе звацца Звонецкім,—ня менш сур'ёзна дадае стары і памыляецца. Сьвет існаваць будзе як і існаваў, а вось парога праз год—два і ня будзе, бо ўсе чыста парогі будуць затоплены ўзьнятай вадою на Днепрэльстане.

Адчуваем, што наш дуб панёсься з непараўнальнай быстрынёй. Што за прычына?

— Парог Цягнінка!—зноў прыходзіць на дапамогу лоцман. А чаму Цягнінка?... Таму, што сам цягне...

А Зараз і Ненасыцец...

Гадзіньнікі паказваюць першую гадзіну. Ззаду параўнальна спакойны Днепр—наперадзе грохат і шум... Над Ненасытцам зусім нізенька стаіць воблачка... Вада разьбіваецца аб каменьні на пыл... Ненасыцец самы страшны парог. Адна назва характарызуе яго, як самага страшнага... Ахвяры, ахвяры і ахвяры... А ён вечна галодны... ненасытны...

Гул аглушае нас. Са сполахам глядзім на Пекла... Наўжо мы паедзем і праз Ненасыцец?.. Нямінуючая пагібель... Кінець вада і з рэвам ліжа каменьні, ад быстрыні плыні кружыцца галава...

— Грэбі!—камандуе лоцман, і чацьвера грабцоў налягці на вёслы...

Як толькі струмень хацеў падкапіць наш дуб і панесьці на каменьнях Ненасытца, здаравенная рука лоцмана паварачвае руль: дуб круга паварачваецца і мы кармою прычальваем ля самага пачатку Ненасытца—да касы, што падзяляе Днепр на дзьве часткі: на парог і канал... Канал—гэта тойжа парог, толькі розьніцца ён ад парогу тым, што чалавечыя рукі павырывалі з дна каменьні,—ачысьцілі гэтым самым шлях ад падводных каменьняў...

А Ненасыцец раве, стогне, вада аббівае бакі аб гострыя граніт Чорнага Каменя, ствараючы вадаспады, фантаны прычудлівых форм, надзяныя платы...

Рэў, стогн, грохат, шум, сьвіст,—цяжка словамі перадаць тую магутную музыку перамогі, з якою стары, адвечны Днепро, перабіраецца праз Ненасыцецкі парог...

На Ненасытцы Днепр цячэ са шпаркасьцю вярсту за дзьве хвіліны часу... Вы ўяўляеце сабе прыродную быстрыню?!.

Ненасыцец праяжджалі каналам, частка-ж экскурсантаў прайшлася па касе, любуючыся пры непасрэднай блізкасьці магутнай веліччы парога...

На полудзень мы спыніліся ля Воўніцкага парогу, ніжэй Ненасытца. Скалы, няма расьлінасьці. Рыбакі на парозе ловяць рыбу. А высока на гары—сяло Воўніч... У скалах маладыя хлопцы рэжуць у „ачко"... Запрашаюць нас...Адмаўляемся...

— Хто можа ўзяцца згатовіць нам полудзень?—запытаўся наш кашавы—Водзіцкі ў рыбакоў.

— А што вам?

— Так, от юшкі, ды жаранай рыбы!..

— Можна.

— А рыба сьвежая?

— Жывыя судакі!

— Пакаж!

— Наўжо маню—глядзі!

У скрынях плёскаліся жывыя судакі, вокуні...

Пакуль рыбакі начысьцілі пуд рыбы для юшкі, я разгаварыўся з старым рыбаком—дзядуляй гадоў пад восемдзесят...

Мне хацелася пачуць з вуснаў старога што-небудзь пра нашых плытагонаў, і я, седзячы на скале, запаліўшы разам з дзедам цыгарку, спытаў:

— Дзед, а хто па Днепру плыты ганяў? Раскажэце мне, што ведаеце пра плытагонаў...

Чамусьці сівы, як лунь, дзед сьпярша ўсьміхнуўся.

— І расскажу,—пачаў дзед-рыбак ціхім голасам.—Раней бывала, многа плытоў гналі па Днепру. Плытагонаў тых мы звалі «ліцьвінамі». Бедны народ быў. За капейкі гналі плыты. А як сядуць есьці—адзін, чорны, як зямля, хлеб. Спакойны быў народ. І гаварылі нібы па-нашаму, але інакш крыху... Доўгія валасы насілі, а на галаве ўсе валосьсі, ды ў адзін волас зрасталіся, казалі што гэта хвароба нейкая, а якая—так і ня памятую...

— Каўтун?—перабіваю дзеда.

— От, от, ковтун! Малады такі, а ведаеце... Даверлівы быў такі той народ—ліцьвіны... Ты яму маніш, кажаш ашпраўду, а ён верыць табе...

— Дык, кажаце, даверлівы быў той народ?—перапытваю старога.

— Асабліва старыкі...Малады сьвет пайшоў—ня тое...

Да змайстраванага з кійкоў трыножніка падвешана вялічэзнае вядро... Гатуецца наш полудзень, юшка з сьвежай рыбы...

— Ну як, рыбы многа?—пытаю дзеда.

— Эт, дзе там... Няма цяпер рыбы. Як Днепрэльстан пачалі будаваць, дык і рыбы ня стала. Кажуць, што перамычкай Днапро перагарадзілі...Адкуль-жа тая рыба... Рыба-ж з мора ідзе... Дойдзе да перамычкі—няма праходу, дык назад у Адэсу, у мора... Няма рыбы...

Я адчуў, што Днепрэльстан—балючае пытаньне для дзеда, бо ён, незадаволіўшыся адказам на пытаньне пра рыбу, працягваў:

— Днепрэльстан...Днепрэльстан...Вось вада ў Днапры падымаецца, затопіць палову нашага сяла... Перасяляцца ў степ трэба... Лесу, праўда, даюць, тысячу рублёў даюць... але што з таго... Прывык я да Днапра, не магу без яго жыць... З раньня да самай ночы на ім час праводжу... Люблю яго, а там,—голы степ і Днапра ня будзе...

Мне стала шкода старога дзеда.

Я зразумеў яго скаргу.

Я хачу суцешыць дзеда

Дзяржаўнае страхаваньне жыцьця--лепшы спосаб самадапамогі.

СТРАХАВАНЬНЕ ЖЫЦЬЦЯ ЗАБЯСЬПЕЧВАЕ ЗАСТРАХАВАНАГА НА СТАРАСЬЦЬ І СЯМ'Ю НА ВЫПАДАК ЯГО СЬМЕРЦІ.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАЛАЖЭНЬНЕ

АБ КАМІСІІ ПА ЗЯМЕЛЬНЫМ УПАРАДКАВАНЬНІ ПРАЦОЎНЫХ ЯЎРЭЯЎ ПРЫ ПРЭЗЫДЫУМЕ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР.

У адмену пастановы ЦВК і СНК БССР ад 29-га кастрычніка 1924 году (З. З. БССР за 1924 г., № 20, арт. 184) зацьвердзіць наступнае Палажэньне аб Камісіі па зямельным упарадкаваньні працоўных яўрэяў пры Прэзыдыуме Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР:

1. Задачамі камісіі па зямельным упарадкаваньні працоўных яўрэяў зьяўляюцца:

а) вызначэньне, па ўзгадненьні з адпаведнымі органамі, райёнаў усяленьня і зямельных вучасткаў з незанятых зямель дзяржаўнага фонду для зямельнага ўпарадкаваньня працоўных яўрэяў;

б) дапамога арганізацыі перасяленьня і ўсяленьня яўрэяў перасяленцаў і расьсяленцаў на вылучаныя вучасткі з дапасаваньнем устаноўленых для перасяленцаў і расьсяленцаў льгот;

в) прыняцьце мер для забясьпечаньня гаспадарчага разьвіцьця земляробаў-яўрэяў на месцах насяленьня і ў прыватнасьці, для магчымага аблягчэньня разьвіцьця працоўным яўрэям саматужна - прамысловай дзейнасьці.

2. Для выпаўненьня гэтых задач камісіі даецца права:

а) уваходзіць ва ўсе дзяржаўныя ўстановы з запытамі, якія дачыняюцца задач ускладзеных на камісію, у тым ліку і аб узгадненьні ўрадавых мерапрыемстваў, якія дачыняюцца зямельнага і, адпаведна з п. „в" арт. 1-га гэтага Палажэньня, саматужна - прамысловага ўпарадкаваньня працоўных яўрэяў;

б) склікаць на пытаньнях зямельнага ўпарадкаваньня працоўных яўрэяў нарады і запрашаць ад адпаведных устаноў і арганізацый вестка і даведкі па пытаньнях, зьвязаных з зямельным і саматужна-прамысловым упарадкаваньнем працоўных яўрэяў, а таксама непасрэдна выбіраць па ўзгадненьні з адпаведнымі ўстановамі і арганізацыямі, весткі па месцах на пытаньнях, зьвязаных з дзейнасьцю камісіі па зямельным упарадкаваньні яўрэяў і весьці вучот вынікаў зямельнага і саматужна-прамысловага ўпарадкаваньня працоўных яўрэяў;

в) уваходзіць у Цэнтральны Выканаўчы Камітэт, Савет Народных Камісараў, Народны Камісарыят Земляробства БССР і другія ўстановы па ўсіх пытаньнях, якія ўваходзяць у кампэтэнцыю Белкамзэту;

г) вызначаць раёны насяленьня і правадзіць засяленьне на вылучаных землях;

д) разьмяркоўваць асобныя групы перасяленцаў на вылучаных для зямельнага ўпарадкаваньня працоўных яўрэяў вучастках; фактычнае выпаўненьне разьмеркаваньня праводзіцца месцовымі зямельнымі органамі;

е) зьмяняць, па ўзгадненьні з адпаведнымі месцовымі зямельнымі органамі, канчальныя тэрміны захаваньня за перасяленцамі яўрэямі зямельных участкаў;

ж) прымаць па ўзгадненьні з адпаведнымі органамі меры для павышэньня прафесыянальнай і тэхнічнай кваліфікацыі і перакваліфікацыі рабочых, саматужнікаў і рамесьнікаў яўрэяў;

з) прымаць меры для забясьпечаньня яўрэяў-перасяленцаў-земляробаў, рамесьнікаў і саматужнікаў сродкамі вытворчасьці, а таксама для каапэраваньня і калектывізацыі іх гаспадарак;

і) прымаць меры для разьвіцьця саматужных і дапаможных промыслаў сярод земляробаў яўрэяў і для індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі;

к) разглядаць і зацьвярджаць планы работ, кіраваць і кантраляваць работу грамадзкіх арганізацый, якія маюць на мэце дапамагаць зямельнаму і саматужна-прамысловаму ўпарадкаваньню працоўных яўрэяў;

л) арганізоўваць пашырэньне сярод яўрэйскіх працоўных мас і шырокіх колаў насяленьня БССР, Саюзу ССР і заграніцай вестак аб задачах і дзейнасьці камісіі.

3. Крэдыты на мерапрыемствы па зямельным упарадкаваньні працоўных яўрэяў у БССР, выдаюцца на рэспубліканскім бюджэце, на кантрасьцу Наркамзема, а на агульна-саюзным бюджэце, па ўзгадненьні з Камзэтам СССР.

4) Старшыня, члены і адказны сэкратар камісіі па зямельным упарадкаваньні працоўных яўрэяў пры Прэзыдыуме Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР назначаюцца Прэзыдыумам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

5. Пры прэзыдыумах акруговых выканаўчых камітэтаў утвараюцца па іх пастановах камісіі па зямельным упарадкаваньні працоўных [яўрэяў (камісіі ЗЭТ). Камісіі гэтыя дзейнічаюць у межах акругі, на грунце данага Палажэньня і па дырэктывах камісіі па зямельным упарадкаваньні працоўных яўрэяў пры Прэзыдыуме ЦВК і пад кіраўніцтвам адпаведных акруговых выканаўчых камітэтаў.

У райёнах выхаду і ўсяленьня ўтвараюцца камісіі ЗЭТ, якія дзейнічаюць на грунце асобай інструкцыі Камзэту БССР.

6. Каштарысы камісіі пры Прэзыдыуме ЦВК праходзяць па кантрасьцу Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР; камісіі, якія ўтвараюцца ў акругах, таксама ўтрымліваюцца на дзяржаўным бюджэце.

7. Камісія мае сваю пячатку.

Час. вык. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Сташэўскі.

ПОЛОЖЕНИЕ

О КОМИССИИ ПО ЗЕМЕЛЬНОМУ УСТРОЙСТВУ ТРУДЯЩИХСЯ ЕВРЕЕВ ПРИ ПРЕЗИДИУМЕ ЦЕНТРАЛЬНОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА БССР.

В отмену постановления ЦИК и СНК БССР от 29 октября 1924 года (С. З. БССР за 1924 г., № 20, ст. 184), утвердить следующее Положение о комиссии по земельному устройству трудящихся евреев при Президиуме Центрального Исполнительного Комитета БССР:

1. Задачами комиссии по земельному устройству трудящихся евреев являются:

а) определение, по соглашению с соответствующими органами, районов вселения и земельных участков из свободных земель государственного фонда для земельного устройства трудящихся евреев;

б) содействие организации переселенчества и водворению евреев-переселенцев и расселенцев на выделенные участки с применением установленных для переселенцев и расселенцев льгот;

в) принятие мер к обеспечению хозяйственного развития земледельцев-евреев на местах водворения и, в частности, к возможному облегчению развития трудящимся евреям кустарно-промышленной деятельности.

2. Для разрешения указанных задач комиссии предоставляется права:

а) входить во все государственные учреждения с представлениями, касающимися задач, возложенных на комиссию, в том числе и о согласовании правительственных мероприятий, касающихся земельного и, в соответствии с п. «в» ст. 1 настоящего Положения, кустарно-промышленного устройства трудящихся евреев;

б) созывать по вопросам земельного устройства трудящихся евреев совещания и запрашивать от соответствующих учреждений и организаций сведения и справки по вопросам, связанным с земельным и кустарно-промышленным устройством трудящихся евреев, а также непосредственно собирать, по согласованию с соответствующими учреждениями и организациями, сведения на местах по вопросам, связанным з деятельностью комиссии по земельному устройству евреев и вести учет результатов земельного и кустарно-промышленного устройства трудящихся евреев;

в) входить в Центральный Исполнительный Комитет, Совет Народных Комиссаров, Народный Комиссариат Земледелия БССР и другие учреждения по всем вопросам, входящим в компетенцию Белкомзета;

г) определить районы поселения и проводить заселение на отведенных землях;

д) разверстывать отдельные группы переселенцев по отведенным для земельного устройства трудящихся евреев участкам; фактическое выполнение распределения проводится местными земельными органами;

е) изменять, по соглашению с соответствующими местными земельными органами, предельные сроки сохранения за переселенцами-евреями земельных участков;

ж) принимать по согласованию с соответствующими органами меры к повышению профессиональной и технической квалификации и к переквалификации рабочих, кустарей и ремесленников-евреев;

з) принимать меры к обеспечению евреев-переселенцев-земледельцев, ремесленников и кустарей средствами производства, а также к кооперированию и коллективизации их хозяйств;

и) принимать меры к развитию кустарных и подсобных промыслов среди земледельцев-евреев и к индустриализации их сельского хозяйства;

к) рассматривать и утверждать планы, работ, руководить и контролировать работу общественных организаций, ставящих себе целью содействие земельному и кустарно-промышленному устройству трудящихся евреев;

л) организовывать распространение среди еврейских трудящихся масс и широких кругов населения БССР, Союза ССР и заграницей сведений о задачах и деятельности комиссии.

3. Кредиты на мероприятия по земельному устройству трудящихся евреев в БССР, отпускаются по республиканскому бюджету, по смете Наркомзема и по общесоюзному бюджету по согласованию с Комзетом СССР.

4. Председатель, члены и ответственный секретарь комиссии по земельному устройству трудящихся евреев при Президиуме Центрального Исполнительного Комитета БССР назначаются Президиумом Центрального Исполнительного Комитета БССР.

5. При президиумах окружных исполнительных комитетов образуются, по их постановлениям, комиссии по земельному устройству трудящихся евреев (комиссии ЗЕТ); комиссии эти действуют в пределах округа, на основании данного Положения и по директивам комиссии по земельному устройству трудящихся евреев при Президиуме ЦИК и под руководством соответствующих окружных исполнительных комитетов.

В районах выхода и вселения образуются комиссии ЗЕТ, действующие на основании особой инструкции Комзета БССР.

6. Сметы комиссии при Президиуме ЦИК проходят по смете Центрального Исполнительного Комитета БССР; комиссии, образующиеся в округах, также содержатся на государственном бюджете.

7. Комиссия имеет свою печать.

Вр. исп. об. Председателя Центрального Исполнит. Комитета БССР А. Хацкевич.

За Секретаря Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Сташевский.

ХРОНІКА.

Выстаўка, прысьвечаная 25-гадоваму юбілею II зьезду партыі.

Зараз заканчваецца работа па абсталяваньні выстаўкі, прысьвечанай 25-цігадоваму юбілею II зьезду партыі.

Выстаўка адчыняецца ў панядзелак, 30 ліпеня.

На выстаўцы маюцца легальныя і нелегальныя выданьні 1900-х гадоў, атрыманы з Масквы, газэты „Искра", пачынаючы з 1902-га году брашура Леніна „к деревенской бедноте" (тлумачэньне для сялян, чаго жадаюць сацыял дэмакраты), выданьня 1904 г. і г. д.

Наогул, выстаўка добра абсталёвана і дасьць магчымасьць шырокім працоўным масам Менску азнаёміцца з працамі 2-га зьезду партыі і з рэвалюцыйным рухам.

У фонд абароны краіны.

У Менскі акруговы савет ТДА-Авіяхіму паступіў цэлы шэраг паступленьняў у фонд абароны краіны.

Так, ячэйка ТДА-Авіяхіму Інбелкульту сабрала 27 р. 55 к., ячэйка ТДА-Авіяхіму рабочому саюзу будаўнікоў—8 р. 15 к. і ад ячэйкі ТДА-Авіяхіму Белхарчтрасту—40 руб.

Арганізацыя аўтамабільнай лётарэі.

Усесаюзнае т-ва Аўтадору наладжвае аўтамабільную лётарэю ў 3 мільёны білетаў, каштоўнасьць кожнага па 50 кап.

Беларуская ўправа Аўтадору дала заяву на 60.000 білетаў.

Білеты будуць распаўсюджвацца на ячэйкам Аўтадору, а таксама па банках.

НКА распрацаваў праэкт аб інспэктарытах нарасьветы.

Наркамасьветы ўносіць на зацьверджаньне Савнаркому БССР праэкт палажэньня аб акруговых інспэктарытах, а таксама аб раённых і гарадзкіх інспэктарох нарасьветы.

Гэты праэкт прадугледжвае падрабязгова функцыі кожнага працаўніка акруговага інспэктарыяту нарасьветы, а таксама раённых і гарадзкіх інспэктароў. Водлуг праэкту маркуецца прадаставіць больш правоў нізавым працаўнікам; пры гарадзкіх і раённых інспэктарох маркуецца ўтварыць камісіі аб няпоўналетніх правапарушніках. Акруговыя камісіі будуць ліквідаваны і за акруговымі інспэктарытамі застаюцца функцыі нагляду за раённымі і гарадзкімі камісіямі.

Школа будзе мець памяшканьне.

Прэзыдыум Менскага гарсавету даручыў Камгасу перадаць першаму прыгарадняму сельсавету недабудаваны дом у вул. Шапіраўка. Гэты дом перадаецца для пабудовы школы пад будынку ў прыгараднай вёсцы Мядзьвежына.

Майстэрня для бяспрытульных дзяцей.

Менскі гарадзкі савет даручыў аддзелу камунальнай гаспадаркі прадставіць акруговаму таварыству „Прыхільнік дзяцей" памяшканьне для арганізацыі шавецкай майстэрні для бяспрытульных дзяцей.

С у д.

Фуражыр--растратчык.

Міхась Мікалаеў Топчэнка спачатку 1926 г. па лістапад месяц 1927 году займаў пасаду фуражыра-закупшчыка працоўнага калектыву «Саладзільчык».

Спачатку ўсё было добра,—Топчэнка выконваў абавязкі фуражыра, атрымліваў пэнсію, якая здавальняла жыцьцё і сям'ю.

Азнаёміўшыся добра з працай, Топчэнка пачаў гуляць, а калі так, дык на гульню патрабаваліся дадатковыя да пэнсіі сродкі.

Купляючы фураж у прыватных перакупшчыкаў і малапісьменных сялян, як напрыклад авёс, сена, салому і інш., Топчэнка фармальных рахункаў на куплены фураж ніколі не складаў, а проста адбіраў ад прадаўцоў расьпіскі на кусках чыстай паперы, якія потым уласнай рукой запаўняў і павялічваў выплачаную суму на некалькі рублёў, якія прысвойваў і траціў на гульню.

Гэткім чынам за час службы Топчэнка склаў шмат падложных рахункаў, а павялічваючы на рахунках суму 570 р. 46 к. страціў на п'янства.

Хоць і сакрэтна Топчэнка праводзіў свае фальшывыя аперацыі, але падлог рахункаў, недалік фуражу і растрата былі выкрыты і Топчэнка папаў пад суд.

На судзе Топчэнка вінаватым часткова сябе прызнаў і факт падложных рахункаў зацьвердзіла выгвараная графічная экспэртыза.

Менскі Акруговы Суд прыгаварыў Міхася Мікалаевага Топчэнка на два гады зьняволеньня в суровым адмежаваньнем і з спагнаньнем з Топчэнка на карысьць працалектыву «Саладзільчык» 570 р. 46 кап.

Дастасаваўшы амністыю, суд скараціў пакараньне Топчэнку да аднаго году в суровым адмежаваньнем.

Кастроў.

Прыём на пэдкурсы.

У гэтым годзе на менскія 2-хгадовыя белар. пэд. курсы будзе прынята на 1-ы курс 135 чал. Прыём заяў будзе цягнуцца да 1 жніўня г. г. Асобы, скончыўшыя самігодкі, ці адпаведныя ім навучальныя ўстановы ў 1926-27 ці 1927-28 г. г. допушчаюцца без іспытаў, іншыя павінны трымаць іспыты. Асобы, якім патрэбна трымаць іспыты, павінны зьявіцца к 10 жніўня (першы дзень іспытаў) у памяшканьне курсаў, Менск, Камсамольская вул. дом № 23.

50 проц. складу курсантаў забясьпечваецца стыпэндыяй. Пры курсах маецца інтэрнат.

Будзе будавацца другі рэзэрвуар на 50000 вёдзер.

Эльводу даручана прыступіць да пабудовы другога рэзэрвуару ёмкасьцю ў 50.000 вёдзер вады. Гэты рэзэрвуар будзе будавацца на тэрыторыі Эльведу.

Нам. старшыні Менскага гарсавету т. Рабіновіч аб гэтым мерапрыемстве зробіць інфармацыю на вытворчай нарадзе рабочых Эльводу.

Усебеларускія курсы па падрыхтоўцы радыё-інструктароў для вёскі.

Беларускае Кіраўніцтва Сувязі адчыняе з 1-га жніўня ў Менску 2-хмесячныя ўсебеларускія курсы па падрыхтоўцы радыё-інструктароў для абслугоўваньня радыё-ўстановак па райёнах і вёсках.

На курсы выключна прымаюцца працаўнікі сувязі, якія ўжо маюць тэхнічныя веды і агульнае азнаямленьне з радыё. Усяго будзе на курсах прынята 30 чал.

Пабудова радыёвузлоў.

Беларускае кіраўніцтва сувязі прыступае ў будучым 1928-29 годзе да пабудовы на БССР каля 20 радыёвузлоў і аднаго магутнага радыёвузла ў Менску.

Пабудова гэтых радыёвузлоў дасьць магчымасьць прымаць радыёперадачы розных радыёстанцый без асобых магутных установак (лампавых прыёмнікаў, антэны, мачты і г. д.) Гэта будзе каштаваць звыш 100.000 руб.

Пабудова ціру ў гарадзкім садзе заканчваецца.

У менскім гарадзкім садзе будуецца лосьнь буйны стралковы цір. Работа на пабудове ўжо падыходзіць к канцу. ТДА-Авіяхім на пабудову ціру адпусьціў 10.000 руб. Гэты цір рыхтуецца для абслугоўваньня рабочых і наогул членаў прафсаюзу г. Менску.

Будаўнічыя матар'ялы для БССР.

Праўленьне Стройсындыкату намецілася завесьці ў БССР на IV квартал бягучага апэрацыйнага году ўсіх будаўнічых матар'ялаў на 263,246 руб.

З гэтай колькасьці будзе завезена мелу 495 тон на суму 6.039 руб., вапны—2.510 тон на суму 39.190 руб., азбэсту—347 тон на 3.817 руб., цэменту партландзкага на 191.700 руб. і інш. будаўнічых матар'ялаў на 5.700 руб.

Каналізацыйныя работы ў Менску.

Каналізацыйныя работы на Менску шырока разгарнуліся.

Кожны дзень пракладваецца каля 200 мэтраў.

На работах штодзённа занята каля 240 рабочых.

Установам дазваляецца загатаўляць паштовыя карткі бяз штэмпэля.

Згодна загаду Нар. Кам. Паштэлю, усім дзяржаўным установам і прадпрыемствам, каапэратыўным і грамадзкім арганізацыям, а таксама прыватным асобам дазваляецца загатаўляць паштовыя карткі бяз штэмпеля.

Гэтае права дасьць магчымасьць шырока выкарыстаць загатоўку паштовых адкрытак для ўсялякага роду рэклям, друкаванай загатоўкі адрасоў і г. д.

Павялічэньне нізавой паштовай сеткі.

За першае паўгодзьдзе бягучага году па Менскай акрузе павялічылася сетка нізавой паштовай сувязі.

Так, калі на 1 студзеня 1928 г. было 236 сельскіх вучасткаў, дык на 1 ліпеня ўжо мецца 260 вучасткаў.

Значны рост пайшчыкаў рабочай каапэрацыі БССР.

За першае паўгодзьдзе бягучага апэрацыйнага году па рабочай каапэрацыі БССР мецца значны рост пайшчыкаў.

Так, калі на 1-га студзеня 1928 г. налічвалася па рабочай каапэрацыі 122.378 пайшчыкаў, дык ужо на 1-га ліпеня налічваецца 154.500 пайшчыкаў (рост на 26 проц.)

Загатоўка грыбоў.

Наркамгандлю БССР распрацоўвае і зацьвердзіў плян загатовак грыбоў па БССР на 1928-29 г.

Асноўныя загатоўшчыкі грыбаў зацьверджаны: Белкавіясаюз, Белсельсаюз і Управа Дзяржгандлю БССР.

Трактары для БССР.

Па паведамленьні Сталага Прадстаўніцтва БССР, Нар. Кам. Гандлю СССР намецілі выдзеліць на 1928-29 год для БССР 50 буйных трактараў.

Сталае Прадстаўніцтва хадайнічае аб павялічэньні гэтай колькасьці трактараў.

Загатоўка тэрэбінкі ў савгасах.

У бягучым годзе Белсельтрэст загатаўляе 325.000 пуд. таварнага сена, з якіх 75.000 пудоў для мясцовага забясьпечаньня.

Гэтае сена будзе загатоўлена ў 3-х лугавых гаспадарках Белсельтрэсту, якія знаходзяцца ў Гомельскай і Мазырскай акругах.

На грамадзкіх работах.

Водлуг даных Наркампрацы за 15 дзён ліпеня ў Гомельшчыне на грамадзкіх работах прапрацавана 8968 чалавекадзён, Бабруйшчыне—3992, Полаччыне—1223 і Мазыршчыне—1007 чалавекадзён. Іншыя акругі чамусь ня лічаць сваім абавязкам інфармаваць НК працы аб ходзе грамадзкіх работ.

Праезд аўстрыйскіх футбалістаў.

27-га ліпеня праехалі праз ст. Менск на бацькаўшчыну 13 аўстрыйскіх футбалістаў, якія прымалі ўдзел у футбольных спаборніцтвах у Маскве.

ЗЬМЕНА ТЭРМІНАЎ ЯЎКІ НА ВУЧЭБНЫ ЗБОР ПА ЗАГАДУ МЕНАКРВАЕНКАМАТУ № 168.

Тэрмін яўкі на вучэбны збор прыпісаных да 2-га артылерыйскага і 6-га стралковага палкоў (маючых адзнаку Акрваенкамату ў асабістых кніжках аб прыпісцы) ваеннаабавязаных радавога і малодшага начальніцкага складу перавосіцца: СМАЛЯВІЦКАГА РАЙЁНУ на 9 верасьня, г. МЕНСКУ і РЭШТЫ РАЙЁНАЎ акругі—на 10-е верасьня. Для малодшага начальніцкага складу—навалерыстаў (3, 4 і 8 эск. воін. спэцыял.), прыпісаных і не прыпісаных, тэрмін яўкі панёшны—9-е жніўня. Парадак і месца яўкі такі самы, як абвешчана ў загадзе № 168.

АКРВАЕНКАМАТ.

Вынікі ўсебеларускага стралковага спаборніцтва.

Сёлета ўпершыню ў БССР праводзілася завочнае стралковае спаборніцтва. У гэтых спаборніцтвах прыняло ўдзел каля 10000 чалавек. Трэба адзначыць, што стралковае спаборніцтва зрабіла аграмадны зьдвіг у галіне разьвіцьця гэтага спорту. Прафсаюзнымі гурткамі за апошнія часы было набыта некалькі сотэн вінтовак, пабудавана шмат стралковых ціраў. Процант удзельнікаў спаборніцтваў на некаторых мясцовых даходзіў да 80.

Трэба адзначыць, што у Гомельшчыне, Віцебшчыне і Аршаншчыне стралковыя спаборніцтвы таксама праводзіліся, але відаць, мясцовыя прафорганы крыху прыспалі і вестак аб ходзе і выніках спаборніцтваў у культаддзел ЦСПСБ не прадставілі, пагэтаму гэтыя акругі выпалі з Усебеларускага конкурсу.

Першае месца ў стралковых спаборніцтвах заняў мясцком саюзу харчавікоў, сьпіртаводачнага заводу. У спаборніцтвах прыняло ўдзел 42,76 проц. агульнага ліку сяброў гэтага калектыву і з 60 магчымых выбілі 44,1 вачка.

Другое месца заняў калектыў фабкому кардоннай фабрыкі імя Леніна ў Пухавічах,— удзельнічала 40 проц. сяброў калектыву і выбілі 47,63 вачкоў.

Трэцяе месца падзялілі калектыў грукому Полацкай мытніцы і калектыў Мазырскага акрвыканкому.

Індывідуальнае першынства ў усебеларускіх завочных стралковых спаборніцтвах заняў: рабочы-чыгуначнік мясцкому № 2 станцыі Менск МБВ т. Ваброўскі, які выбіў 57,5 вачкоў і столькі-ж выбіў рабочы Пухавіцкай фабрыкі імя Леніна т. Кунаш. У наступную нядзелю гэтыя таварышы будуць рабіць перастрэлку і тады будзе вырашана хто з іх займе першае і хто другое месца.

Трэцяе месца заняў т. Калошын, з мясцкому саўгандльслужачых ЦВК і СНК БССР т. Калошын, выбіў 57 вачкоў.

З жанчын першае месца заняла т. Сакаловіч з мясцкому Менскага ЦРК—выбіла 53 вачкі.

Другое і трэцяе месца падзялілі т. Козак з мясцкому ЦВК і СНК і т. Кірэенка з Менскага ЦРК.

Фабзаўмясцкомы і індывідуальнікі, якія занялі першыя тры месцы, будуць ЦСПСБ прэміраваны.

Культурныя навіны.

АМАТАР-ЭТНАОЛЁГ.

Настаўнік Асьвейскага райёну, Полацкай акругі, т. Гнядоўскі, зьяўляецца сапраўдным мастаком на навіраньні і зьбіраньні калекцый розных кубурак. Т. Гнядоўскі да гэтага часу сабраў 20 скрынак розных жукоў, матылькоў і інш. кузурак Асьвейскага райёну.

ІБК устанаўлівае сувязь з т. Гнядоўскім, каб апошні працаваў на заданьні зоолёгічнага музэю ІБК.

ПАСЫЛКА НАСТАЎНІКАЎ У БЕЛАРУСКІЯ ШКОЛЫ РСФСР.

Гэтымі днямі Наркамасьветы БССР накіраваў у беларускія школы Сібіры 14 настаўнікаў. Апроч гэтага, ёсьць запатрабаваньні на беларускіх настаўнікаў з Клінцоўскага павету, Бранскай губ. і Вялікалуцкай акругі.

Шмат настаўнікаў-беларусоў вгаджаюцца паехаць на працу ў беларускія школы РСФСР.

ЭКСПЭДЫЦЫІ ІНБЕЛКУЛЬТУ.

У се аддзел ІБК улета [illegible] шэраг экспэдыцый па вывучэньні розных галін гаспадаркі і культуры БССР.

Гуманітарны аддзел арганізаваў наступныя экспэдыцыі: дыялекталёгічную на Бабруйскай, Магілёўскай і Полацкай акругах у складзе праф. праф. Дурнаво і Бувука, экспэдыцыю на вывучэньні народнай музыкі, этнаграфічную—на Мазыршчыну і па вывучэньні народнага мастацтва.

Археолёгічная камісія наладзіла экспэдыцыі на Менскай акрузе, на Сяродзінім Сожы і Дняпры, у в. Бэрдыж, Чачэрскага райёну, Гомельскай акругі, па верхнім Дняпры і па Заходняй Дзьвіне.

Аддзел прыроды і гаспадаркі наладзіў экспэдыцыі геолёгічнага Інстытуту на Асінастрой, Мсьціслаў, Парадзіна, р. Васьлёр, Крычаўскі райён і інш.

Геаграфічная экспэдыцыя вакіравалася ў Ворну, Дуброўну, Асінавуд, Высачаны, Бабінавічы, Лёзну, Багушэўскае Сяньо, Талочын.

Апроч гэтага будуць працаваць экспэдыцыі: зоолёгічная ў Мазырскай і Гомельскай акругах, на вывучэньні прамысловасьці, курортнай справы—у Полаччыне і Віцебшчыне, антрапалёгічная—у райёны раёй Ухлесьці і будуць зроблены 40 геомагнэсавых вымкаў у Магілёўскай акрузе.

Яўрэйскі аддзел арганізаваў экспэдыцыю у Мазырскую акругу і ў Дуброўну.

ЭКСКУРСІЯ НАСТАЎНІКАЎ РСФСР У ІБК.

40 настаўнікаў беларускіх школ РСФСР, якія зараз пераквалёфікоўваюцца на цікорных беларускіх курсах, наладзілі 27-га ліпеня экскурсію ў ІБК, каб яны знайміліся з дасягненьнямі беларускай культуры. Настаўнікі беларускіх школ у РСФСР зладзіліся наладзіць культурную сувязь з Інбелкультам, збіраючы на месцах розныя весткі аб гаспадарчым і культурным стаўленьні беларускага насельніцтва Сібіры, Вялікалуцкай акругі і Смаленшчыны.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК

(НА 30-VII 1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз. — прад. 4—63, куп. 4—61.

Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—16, куп. 5—14.

Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—06,5, куп. 5—04,5.

Абл. 10 пр. паз. 27 году —прад. 25,96, куп. 25—86.

Абл. дзярж. паз. 26 г.—прад. 121—75, куп. 119—75.

Абл. 12 пр. дзярж. паз. прад. 101—99, куп. 101—94.

Абл. 6 проц. паз. індустр. прад. 25—18 куп. 25—08.

Апавяшчэньне.

САД АСЬВЕТЫ:

Сёньня кіно „Пракурор Иордан". Пачатак а 10 гадз.

Білеты 10-15 кап.

У выпадку дрэннага надвор'я, кіно перанесіцца ў Дом Асьветы.

Паштовая скрынка.

— Ваш допіс «Нішчэ аб насьпеваных газэтах» ня пойдзе. Не задавайцеся пытаньнямі агульнага характару, а лепш давайце канкрэтныя факты аб сельскараўскай працы на вёсцы.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛЯНС

Паявога Таварыства мяснога гандлю Беларусі „БЕЛМЯСГАНДАЛЬ"

АКТЫЎ. *на I-е кастрычніка 1927 г.* **ПАСЫЎ.**

1	МАЕМАСЬЦЬ			20040	58	1	КАПІТАЛЫ:						
2	Тавары і матар'ялы			58536	78		а) Паявы капітал	850000	—				
3	Грашовыя сродкі:						б) Амартызацыйны	4553	40	354553	40		
	а) Каса	3078				2	ФОНДЫ:						
	б) Бягучы рахунак	6511	20	9589	20		а) На пакрыцьцё няпэўн. даўгоў			37936	73		
4	Каштоўныя і проц. паперы			135	—	3	ПАЗЫКІ І ССУДЫ:						
5	Падсправаздачныя сумы			59339	97		а) Спэц. бягуч. рахункі	52887	98				
6	Вэкс. і дакум. да атрым.:						б) Ссуды пад тавары	10800	—	63687	98		
	а) Вэксалі ў партфелі	10654	06			4	Банкі па вэксэл.			162139	93		
	б) „ „ вучоце	162139	93			5	Вэксалі выдадзеныя			27570	85		
	в) „ „ пратэставаныя	3246	14			6	КРЭДЫТОРЫ:						
	г) Наложаныя плацяжы	72	14	176112	27		а) Пакупшчыкі	7332	14				
7	Неразьмерк. і неаплач. пай.			137800	—		б) Дастаўшчыкі	3876	78				
8	ДЭБІТОРЫ:						в) Рабочыя і служачыя	1879	77				
	а) Пакупшчыкі	89044	34				г) Пайшчыкі	219	08				
	б) Дастаўшчыкі	8699	84				д) Іншыя крэдыторы	5130	48	18438	25		
	в) Рабочыя і служачыя	326	07			7	Падсправаздачн. сумы			18	95		
	г) Камісіянэры	5774	65			8	Прыбыткі буд. справ. году			1411	93		
	д) Пайшчыкі	133	03										
	е) Іншыя дэбіторы	2831	78										
	ж) Няпэўныя даўгі	35532	52	142342	23								
9	Выдаткі будуч. справ. пэр.			11661	93								
10	СТРАТЫ:												
	а) Да справазд. перыяду	27397	86										
	б) За справаздачны год	22802	20	50200	06								
	БАЛЯНС			665758	02		БАЛЯНС			665758	02		
	ПА-ЗА БАЛЯНСАМ:						ПА-ЗА БАЛЯНСАМ:						
1	Дэбіторы па гаран. вэкс.	90800	—			1	Вэкс. гарант. выдадзен.	90800					
2	Вэкс. гарант. атрыманы	11065	—	101865	—	2	Крэдыт. па гаран. вэкс.	11065		101865	—		
				767623	02					767623	02		

ДЭБЕТ. **Рахунак прыбыткаў і страт.** **КРЭДЫТ.**

1. Агульныя выдаткі		121.863—29	1. Прыбытак ад рэаліз. тавараў
2. Процанты выплачаныя		23.424—17	2. Камісія атрыманая:
3. Камісія выплачаная		11.015—55	а) па рэалізацыі ўласных тавар. 4.497—15
4. Падаткі і зборы		25.137—07	б) „ „ чужых „ 15.363—19
5. Адлічэньні ў рэз. па няпэўных даўгох і пратэст вэксэл.		25.223—71	3. Процанты атрыманыя
6. Амартызацыя маемасьці		1.015—10	4. Паступлен. па няпэўных даўгох
7. Страта, усушка, псота і недахоп тавар.		17.647—58	5. Лішкі тавараў і матар'ялаў
		225.326—47	6. Розныя прыбыткі
			Страта за справаздачны год

Згодна пастановы агульнага сходу пайшчыкаў Белмясгандлю ад 21 чэрвеня 1928 г. страта за 1926-27 г. у руб. 22.802—20 застаецца на балянсе.

Гэты балянс зацьверджан сталай камісіяй пры НКФ Беларусі 28 красавіка 1928 г.

Ст. Інспэктар Кіраўніцтва Дзяржаўных Прыбыткаў НКФ БССР Д. СТАЯНОЎСКІ.

Дырэктар Белмясгандлю МАЦЬВЕЕЎ.

Галоўны Бухгальтар ШЛАПАКОЎ.

1-я друкарня.

ЛЕТНІ САД кіно «КУЛЬТУРА». Савецкая, 71.	Ад аўторка—24 ліпеня. Новы бытавы фільм „МЯРЭЖЫ" (кружэва) У 7 частках.
КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".	Савецкі мастацкі фільм АМОК трагедыя ў 6 частках. па раману Л. Цвэйга. Пачатак у 7 в пакав. гадз.
КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».	Выдатны савецкі фільм ХТО ТЫ ТАКІ? Драма ў 6 частках.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	Замежны фільм МАРСКІ ЯСТРАБ Кіно-раман у 9 частках.

БЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ заводзіць да ведама ўсіх устаноў і грамадзян, што з 1-га жніўня г. году заняткі у канторы і казначэйскай частцы НКФБ будуць пачынацца замест 9 гадзін раніцы а 10 гадзіне і будуць цягнуцца да 4 ½ гадз. дня.

Адміністрацыя канторы.